Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая ГАЗЭТА

ПАНЯДЗЕЛАК
6 сакавіка 1932 г.
№ 53 (3442)

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: Перадавы—За аўладаньне агратэхнікай, за высокі ўраджай. Саветы і работа на транспарце (3 стар.). С. КУДЗІНАЎ. Важнейшае зьвяно калгаснай вытворчасьці. (2-я стар.).
НА ЎСЕБЕЛАРУСКІМ АГРАЗЬЕЗДЗЕ. (1 стар.).
Зламаць апартуністычнае супраціўленьне вапнаваньню глебы. (1 ст.).
Поўнасьцю засыпаць насенфонды ў бліжэйшыя дні. 2 стар.).
ЖЫВЕЛАЗАГАТОЎКІ. Выканаць плян і кварталу (3 стар.).
ФІНПАХОД. Да канца 3 этапу засталася адна дэкада. (2 стар.).
Недахоп ў грубых кармох папоўніць сенам з гальля.
Пастанова НКЗБ і Калгасцэнтру аб арганізацыі працы ў калгасах.
ЗА ГРАНІЦАЙ.

За аўладаньне агратэхнікай, ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ

Густой сеткай МТС пакрываецца наша неаб'ятная сацыялістычная краіна. Растуць, мацнеюць, разьвіваюцца гаспадарча саўгасы, умацоўваюцца калгасы. Сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі стаў рашаючым фактарам. СССР зрабіўся краінай самай буйнай сельскай гаспадаркі.

Рост індустрыі, вялікі размах выробу трактароў і сельска - гаспадарчых машын з кожным годам узмацняюць тэхнічную базу с. г.

Сацыялізм перамагае. З кожным днём усё больш паляпшаецца дабрабыт шырокіх працоўных мас, расьце культурны ўзровень. Не адзіночкі, а масы, мільёны, грандыёзным патокам бяруць крэпасьці навукі, аўладаюць тэхнікай. Рабочая кляса, калгасьнікі і працоўныя масы разумеюць, што ўсё гэта магчыма толькі пры дыктатуры пралетарыяту, пры савецкай ўладзе, пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі.

5-га сакавіка адкрыўся Ўсебеларускі агра - зоатэхнічны зьезд. Перад зьездам стаяць задачы выключнай важнасьці. Шырока ўнядрыць перадавую вышэйшую зоа - тэхніку ў нашу сацыялістычную сельскую гаспадарку.

Савецкая ўлада арганізавала цэлую сетку навуковых інстытутаў, дасьледчых станцый па падняцьню якасьці сельска - гаспадарчай прадукцыі. У гэтай галіне мы маем вялікія дасягненьні. Лепшыя, адданыя справе рабочае клясы, спэцыялісты па-сапраўднаму змагаліся і змагаюцца над вырашэньнем праблем высокага ўстоўліва ня ўраджаю.

Зразумела, што ўсе дасягненьні на бываюць тады толькі вартасьць, калі яны будуць ўжыты ў шырокім масштабе. А для гэтага мы маем усе ўмовы. Наша сацыялістычнае будаўніцтва як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы ня ведае капіталістычнай канкурэнцыі. Усе нашы вынаходніцтвы і дасягненьні навукі і тэхнікі могуць і павінны быць выкарыстаны.

Вялікая адказная ганаровая роля ўскладваецца на агранома. Нашы аграномы павінны ўсё свае веды аддаць для падняцьня ўраджайнасьці. Для гэтага патрэбна канчаткова і на заўсёды зьнішчыць стары казённы бюракратычны падыход. Ня ў канцэлярыях зажапвацца паперамі, ня толькі «корпацца» ў статыстычных зьвестках, выконваць ролі «спэцыялістаў дакладчыкаў», а на саўгасных, калгасных палёх змагацца за сацыялістычную перабудову сельскае гаспадаркі. Патрэбна самая цесная жывая сувязь з брыгадамі, канкрэтная таварыская дапамога паляводам, актыўны ўдзел у вытворчых нарадах, шырока папулярызаваць, прапагандыраваць агра - зоа - тэхніку. Толькі пры такіх умовах аграном можа даць патрэбную карысьць у падняцьні ўраджайнасьці на сацыялістычных палёх.

Асабліва вялікую ролю ў падвышэньні ўраджайнасьці, у падняцьці вытворчых сіл саўгасаў і калгасаў адыгрывае МТС — гэта магутная зброя ў справе арганізацыйна - гаспадарчага замацаваньня калгасаў, гэты посьбіт сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. МТС мае ўсе магчымасьці і павінна неадкладна ўзяцца за вырашэньне праблемы падвышэньня ўраджайнасьці. Перабудова МТС на трактарныя атрады, прымацаваньне трактарных брыгад да пэўных калгасаў абавязваюць яшчэ больш упарта змагацца за бальшавіцкі ўраджай. Вытворчы вучастак МТС павінен зьвяцца тым апорным пунктам, на якім сапраўды будзе ажыцьцяўляцца ўкараненьне агра - тэхнікі, павінен паказаць прыклады бальшавіцкай арганізацыі вытворчасьці.

Разам з тым, неадрыўнай часткай работы МТС, як і ўсёй сельскай гаспадаркі, зьяўляецца барацьба за тэхнічныя культуры. У гэтай галіне МТС павінна заняць пачэснае месца, павінна ісьці ў авангардзе. Нельга забываць, што кулацтва з асаблівай сілай імкнецца сарваць пашырэньне плошчы тэхнічных культур, вядзе ўпартую барацьбу супроць мерапрыемстваў партыі і ўраду па спэцыялізацыі раёнаў. Няма сумненьняў, што пад кіраўніцтвам партарганізацый шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў дадуць адпор кулацтву.

Спэцыялізацыя раёну, узьняцьце ўраджайнасьці, якасьці зернавых і тэхнічных культур, барацьба за вырашэньне праблемы сацыялістычнай жывёлагадоўлі самым цесным чынам зьвязаны з барацьбой за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

Поўнасьцю і ў вызначаны тэрмін укамплектаваць жывёлагадоўчыя сацыялістычныя фэрмы. Забясьпечыць іх кармавой базай, добрым даглядам. Забясьпечыць вэтэрынарны дагляд— баявая задача партарганізацый, калгасьнікаў і спэцыялістаў. Спэцыяліст вэтурач, вэтфэльдчар павінен навучыць мінімуму вэтэрынарнай сэкты работнікаў, якія даглядаюць жывёлу.

Усе мерапрыемствы па падняцьню ўраджайнасьці, па шырокаму ўнядрэньню агра-зоа-тэхнікі — гэта мерапрыемствы па падняцьню дабрабыту і культуры шырокіх працоўных мас і ў першую чаргу калгасьнікаў, гэта мерапрыемствы для яшчэ больш хуткага руху ўперад нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Вось чаму барацьба за высокі ўраджай, барацьба за максімальна кароткі тэрмін засеву палёў, за жорсткія тэрміны сяўбы і правядзеньне сапраўднай бальшавіцкай падрыхтоўкі, забясьпечаньне насенфондаў і г. д. — кроўная справа калгасьнікаў і ўсіх працоўных.

Вядучы рашучую барацьбу па падрыхтоўцы да сяўбы, мы гэтым самым вядзем барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў. Правільна разьмяркоўваць рабочую сілу, разьбіць на вытворчыя брыгады, вылучыць кожнай брыгадзе пэўны вучастак, замацаваць патрэбны інвэнтар і цягавую сілу, з корням зьнішчыць, выгнаць з калгасаў абязьлічку і ўраўнілаўку — баявая задача. На гэтым вучастку работы аграномы зоатэхнікі павінны быць у перадавой лініі.

Уся работа нашага гіганцкага сацыялістычнага будаўніцтва, як у горадзе, так і на весцы адбываецца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Кулацтва і яго дапаможнікі імкнуцца ўсімі сіламі, усімі мерамі затармазіць пераможны ход будаўніцтва сацыялізму. Разьбіваючы, руйнуючы кулацкае супраціўленьне, вядучы рашучую барацьбу з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, барацьбу супроць «левага» апартунізму і прымірэнцтва да іх, мы пад сьцягам ленінскай партыі цьвёрдым крокам ідзем уперад да новых перамог.

Усебеларускі агра-зоа-тэхнічны зьезд — гэта яшчэ адна перамога партыі на фронце аўладаньня навукай і тэхнікай. Капіталістычны сьвет ідзе да ўпадку, да катастрофы. Там ідзе дэгрэдацыя навукі, тэхнікі, як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы прыспешным тэмпам. У нас— бурны рост. Агра-зоа-тэхнічны зьезд гэта яшчэ адзін доказ перамогі сацыялізму, нашага бурнага росту — укараненьня навукі і тэхнікі.

Шырокія масы калгасьнікаў, аднаасобнікаў, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі возьмуць крэпасьць агра - тэхнічнай навукі і тэхнікі. І гэта яны зробяць ударнымі тэмпамі. На сацыялістычных палёх ураджай павінен быць і будзе больш высокім, лепшай якасьці, больш цьвёрда-устойчывым, чым на капіталістычных. Гэтага дамогуцца ўдарнікі сацыялістычных палёў у самы кароткі тэрмін.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Грандыёзная дэманстрацыя ў Шанхаі

Антыяпонскі рух ня здушаны ботам акупантаў

ШАНХАЙ. 6-III. У Шанхаі адбылася вялізарная дэманстрацыя кітайскага насельніцтва. У дэманстрацыі ўдзельнічала вскальку сот тысяч чалавек. З усіх куткоў і закавулкаў нясушчымным струменем уліваліся ў галоўныя вуліцы тысячы людзей з нацыянальнымі сьцягамі. Зьяўліся сотні аўтамабіляў і грузавікоў перапоўненых дэманстрантамі. Увесь друк аднадушна адзначае, што гэткай вялізарнай дэманстрацыі ў Шанхаі свколі яшчэ ня было. Усе кітайскія магазыны, нядаўна прыкрыўшыяся чужаземнымі сьцягамі, вывесілі нацыянальныя кітайскія сьцягі. Лодкі і цампаны разупрыгожаны агнямі і сьцягамі. Паліцыя, на якую напалі зьвяцкі, на працягу доўгага часу нічога не магла ўжыць. Толькі пасьля 11 гадзін увечары дэманстранты былі выдалены з галоўных вуліц.

У часе дэманстрацыі паказаўся аўтамабіль з японскімі афіцэрамі. Натоўп заўважыўшы японскія сьцягі, аб кружыў аўтамабіль, выцягнуў афіцэраў і зьбіў іх. З вялікай трудносьцю паліцыі ўдалося выратаваць афіцэраў, адвёўшы іх у паліцэйскі вучастак, дэманстранты сабраліся каля вучастку і ня гледзячы на тое, што прыбыўшы атрад францускага войска даў некалькі залпаў адмовіліся разыйсьціся. Пасьля гэтага паліцыя і салдаты ата кавалі дэманстрантаў і разагналі іх.

Усе даныя гавораць аб тым, што дэманстрацыя была арганізавана кітайскай буржуазіяй з мэтай адцягнуць увагу рабочых, студэнцкіх і дробнабуржуазных мас ад барацьбы з Нанкінскім урадам, супроць якога нарастае хваля масавага незадаволеньня. Дэманстрацыя паказала настрой шырокіх пластоў кітайскага народу. Яна паказала, што анты - японскі рух не зламаны ваенным націскам. Рабочыя, студэнты і дробна - буржуазнае насельніцтва расчаравана палітыкай Нанкінскага ўраду і выказваюць абурэньне наконт адступленьня кітайскага войска не атрымаўшага падтрыманьня.

Звыш 60 тыс. японскага войска на Шанхайскі фронт

ШАНХАЙ. 5-III. Буйны дэсант японскай пяхоты высадзіўся ўчора ў Люхэ. У Шанхайскім раёне налічваецца звыш 60.000 японскага войска.

Камандваньне 19-ай кантонскай арміі ўстанавіла лінію абароны пераскакоўчую Шанхай-Нанкінскую чыгунку на захад ад ст. Хуанду (ля Нансяну). Пазіцыі ўзмацняюцца, устанаўляюцца кулямётныя гнёзды. Другая лінія абароны ўстаноўлена на ст. Лоуганян. Адначасова значныя кітайскія сілы сканцэнтраваны ў раёне ст. Аньцін і гор. Цінпу.

Кітайскае ваеннае камандваньне выдала бюлетэнь, у якім заяўляе, што пераракор афіцыйным японскім паведамленьням аб спыненьні варожых дзеяньняў, японскае войска працягвае наступленьне на цяньдзінскім фронце.

Дагавор 9 дзяржаў растоптан

НЬЮ-ЕРК. Крытыкуючы японскія заявы аб непрымянальнасьці міжнародных дагавораў да Кітая, як да нагарга пізаванай дзяржавы ліберальны «Нейшэн» піша: растаптаўшы дагавор 9 дзяржаў, Японія цяпер прапануе замяніць яго другім, яшчэ-б легалізаваў незаконныя дзеі Японіі і бамбардыроўку ў Шанхаі».

Супярэчнасьці паміж Нямеччынай і Францыяй

ПЛЯН ФРАНЦУСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ—ІЗАЛЯВАЦЬ НЯМЕЧЧЫНУ.

БЭРЛІН. 4-III. Выступленьне Тардзье на карысьць стварэньня федэрацыі прыдунайскіх краін і краін малой Антанты зноў абвастрыла барацьбу паміж Францыяй і Нямеччынай за ўплыў у Сярэдняй і Паўднёва-Усходняй Эўропе. Нямеччына займае абарончую пазіцыю. Нямецкія ўрадавыя колы і друк выказваюць вялікую трывогу наконт намераў Францыі адрэзаць Нямеччыну ад юга-ўсходу Эўропы шляхам стварэньня прыдунайскай федэрацыі.

Нямецкі ўрад пачаў контрвыступленьне заявіўшы ў афіцыйнай ноце, што Нямеччына згодна прадставіць Аўстрыі асобныя эканамічныя перавагі.

Берлінскі карэспандэнт «Дэр Фрэйэ Прэс» паведамляе, што нямецкі ўрад цьвёрда намераны змагацца ўсімі магчымымі ў яго распараджэньні эканамічнымі сродкамі супроць ажыцьцяўленьня плянаў прыдунайскай федэрацыі, у выпадку калі да ўдзелу ў ёй ня будзе прыцягнута і Нямеччына.

Аб разброеньні ня можа быць і гутаркі. Бюджэт вайны зацьверджан

ВАРШАВА. 5-III. Учора пры абгаварэньні ў сэйміе бюджэту вайсковага міністэрства, а таксама міністэрства замежных і ўнутраных спраў, большасьць выступаўшых прамоўцаў заклікала да ўзмацненьня бюджэту.

Дакладчык па бюджэце вайсковага міністэрства сэнатар Вэростэр заявіў: «Ніякае зьмяншэньне нашых узброеных сіл немагчыма, як немагчыма так сама якое-б то ні было скарачэньне бюджэту вайсковага міністэрства».

Забастоўка ў Беластоку

ВАРШАВА. 4-III. У Беластоку выбухнула некалькі дзён таму назад забастоўка на тэкстыльнай фабрыцы Бэкэр у адказ на спробы прадпрыемцаў вынізіць заробкі. Дырэкцыя адказала абвешчаньнем лёкаўта. Было звольнена больш 400 рабочых. Узамен звольненых дырэкцыя пачала прымаць штрэйкбрахераў. Адбылася сутычка паміж бастуючымі і паліцыяй.

Учора ў Беластоку была абвешчана адзінадзённая забастоўка пратэсту ў адзнаку салідарнасьці ня толькі з бастуючымі рабочымі фабрыкі Бекера, але і ўсеагульнай стачачнай барацьбой гарнякоў Краканскага і Дамброўскага басэйнаў. Забастоўка ахапіла ўсе прадпрыемствы ў Беластоку.

(ТАСС).

Дэфіцыт польскага бюджэту расьце

ВАРШАВА. 3-III. Газэта Гандлёвая піша, што бюджэтны дэфіцыт з красавіка 1931 г. па студзень 1932 г. уключна складае 129,8 млн. злотых.

Вайна па- а „нэйтральнай" зонай

ШАНХАЙ. 5-III. Японскае войска выступіла з Шанхаю за межы 30 клм. зоны і праследуе кітайскія атрады, адступаючыя з боем з Нансяну (на захад ад Шанхаю). Згодна японскім паведамленьням, ваенныя дзеяньні ў гэтым раёне выкліканы необходнасьцю, таму што «японскае войска была абстралена кітайскім войскам».

Нанкінскі ўрад пастанавіў аднавіць дыплёматычныя зносіны з СССР

ШАНХАЙ. 4-III. Паводле паведамленьняў агенцтва Рэйтэр з Нанкіна, міністэрства замежных спраў афіцыйна заявіла аб тым, што на афіцыйнай нарадзе камісіі па замежных справах нанкінскага ўраду пастаноўлена: па-першае, зацьвердзіць пасылку карнай экспэдыцыі супроць новай арганізуемай Японіяй дзяржавы ў Манчжурыі, па-другое, аднавіць дыплёматычныя зносіны з СССР (ТАСС).

***

ТОКІЁ. 4-III. Паводле паведамленьня агенцтва Рэйтэр з Лояну, пленум Гаміндана прыняў 2 сакавіка рашэньне аднавіць дыплёматычныя зносіны паміж Кітаем і СССР. (ТАСС).

Выбары прэзыдэнт ў Германіі

Да надыходзячых выбараў нямецкага прэзыдэнта, камуністычная партыя вядзе ўзмоцненую і пасьпяховую прапаганду пад лёзунгам: «КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ». Пралетарыят выставіў сваім кандыдатам тав. ТЭЛЬМАНА. Прадоўжваючы сваю здрадніцкую палітыку, сацыял - фашысты зьбіраюцца галасаваць за Гіндэнбурга.

На ЗДЫМКУ: агітацыйны пункт нямецкай кампартыі ў Шарлотэнбурзе (Бэрлін). Паводле патрабаваньня паліцыі з верхняга плякату «ЗАЯВАЧНІКІ І АГІТАЦЫЙНЫ ПУНКТ ЧЫРВОНЫХ ПЕРАДВЫБАРНЫХ АГІТАТАРАЎ», было выкрэсьлена слова «чырвоных». Плякат з лёзунгам: «ТОЛЬКІ ТЭЛЬМАН МОЖА БЫЦЬ КАНДЫДАТАМ ПРАЦОЎНЫХ», быў поўнасьцю рэквізаваны.

АДКРЫЎСЯ ДРУГІ ЎСЕБЕЛАРУСКІ агразоатэхнічны зьезд

ДЗЕНЬНІК ЗЬЕЗДУ

5 сакавіка а 6-й гадзіне 30 хв. пры перапоўненай залі Унівэрсытэцкага гарадка Народны камісар земляробства БССР тав. Рачыцкі адкрыў другі Ўсебеларускі агразоатэхнічны зьезд.

Тав. Рачыцкі ў сваёй кароткай ўступнай прамове характарызуе той асаблівы пэрыяд, у каторы сабраўся другі агразоатэхнічны зьезд і тыя важнейшыя пытаньні, якія пастаўлены на абгаварэньне зьезду.

— Наш зьезд,—гаворыць тав. Рачыцкі,—адрозьніваецца ад першага зьезду тым, што ў ім прымаюць удзел практыкі сацыялістычнага тыпу гаспадаркі—спэцыялісты, ударнікі саўгасаў, МТС і калгасаў.

Тав. Рачыцкі адзначае, што задачы, якія стаяць перад другім агразоатэхнічным зьездам зусім іншыя, больш важныя чымся перад першым.

— Сёньня нам прад'яўляюць пэўны рахунак, пэўныя запатрабаваньні,—гаворыць тав. РАЧЫЦКІ,—калгасьнікі, рабочыя саўгасаў, чаго мы ня мелі раней. Калгасы, саўгасы і МТС даюць магчымасьць зусім па новаму паставіць пытаньне ўзьняцьця ўраджайнасьці і па новаму іх вырашыць.

— Мы сабраліся сюды, — лепшая частка спэцыялістаў, калгасьнікаў, рабочых саўгасаў, каб абгаварыць практычныя пытаньні знайсьці шляхі практычнага афармленьня, ажыцьцяўленьня тых дырэктыў партыі, якія мы маем па лініі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, з тым, каб гэтыя пляны распрацавацьць больш проста і зразумела для шырокіх колаў калгасьнікаў, рабочых саўгасаў— у больш кароткі тэрмін прымяніць іх на практыцы і тым самым выканаць дырэктывы партыі па падвышэньні вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы.

***

У прэзыдыум зьезду аднагалосна абіраецца 53 ч., у тым ліку т. т. Пікало, Шаранговіч, Галадзед, Рыскін, Іваноў, Чарвякоў, Рыжоў, Кавальчук, Рачыцкі, Міцкоў і інш.

У ганаровы прэзыдыум зьезд абірае пад бурныя воплескі палітбюро ЦК УсеКП(б) т. т. Рудзутака, Янаўлева, Ленскага і Тэльмана.

Пасьля абраньня прэзыдыуму з вялікім дакладам «аб задачах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, аўладаньня агразоатэхнікай, падвышэньня ўраджайнасьці і ролі спэцыялістаў» выступіў народны камісар земляробства БССР тав. Рачыцкі.

5 сакавіка зьезд заслухаў першую палову даклада тав. Рачыцкага.

***

На ранішнім паседжаньні 6 сакавіка тав. Рачыцкі закончыў свой даклад, які зьезд выслухаў з вялікай увагай.

Па дакладзе разгарнуліся шырокія спрэчкі.

Прафэсар Кайгарадаў у сваім выступленьні спыніўся на тым, што апрача ўсіх іншых пытаньніх мерапрыемстваў у сельскай гаспадарцы для падвышэньня ўраджайнасьці і ў мэтах барацьбы са стратамі, неабходна прыстасаваць усю работу сельгасвытворчасьці да кліматычных умоў.

— Пытаньне барацьбы за ўраджай ёсьць пытаньне ня толькі правільнай расстаноўкі сіл, але ў значнай ступені сваячасовасьці сэвіны, што дае ўвязка з кліматычнымі ўмовамі. Кожную культуру трэба разглядаць з пункту погляду яе кліматычных запатрабаваньняў, прыстасаваўшы ўсю работу так, каб тэрміны пасеву і ўборкі супадалі з найбольш спрыяючымі ўмовамі надвор'я і клімату.

Работнік станцыі па барацьбе са шкодникамі ў сельскай гаспадарцы тав. Кабалоўскі спыняецца на тым, што на мясцох ведамі мала зьвяртаецца ўвагі на барацьбу са шкодникамі сельскай гаспадаркі.

На ранішнім паседжаньні ў спрэчках прымалі ўдзел, ДАРОЖКІН, КАМАЯЎ (Магілёўскі раён) МАРКАВЕЦ, ВІЛЕНЬ, КАБАЛОВІЧ і БАРЫСЕНКА.

***

Учора на вячэрнім паседжаньні агразоатэхнічнага зьезду працягваліся спрэчкі па дакладу Наркома Земляробства БССР тав. Рачыцкага «Аб задачах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, аўладаньні агразоатэхнікай, узьнёму ўраджайнасьці і ролі спэцыялістаў».

У спрэчках прымалі ўдзел т. т. Бэнарэвіч, (Райагранам Віцебскага раёну), Ганчарык (Біялёгічны інстытут БАН), Максімаў (аграном Церахаўскай МТС), Пратасеня (агрогледавы інстытут БАН), Малахоўскі (калгас імя Чарвякова, Віцебскага с.-с., Віцебскага раёну), Каратковіч (Горацкая Зональна-лёнаводная станцыя), Закрэўскі (калгас імя Ланцуцкага, Руднянскага с.-г., Віцебскага раёну) і інш.

На зьезьдзе выступіў з вялікай прамовай прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук тав. Горын.

Усебеларускае спаборніцтва раёнаў на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы

Зламаць апартуністычнае супраціўленьне вапнаваньню глебы

7 лютага

Перад веснавой сяўбой чацьвертага завяршаючага году пяцігодкі партыяй і ўрадам ва ўсю шырыню пастаўлена адказнейшая задача — дабіцца рашучага падвышэньня якасных паказьнікаў у сельскай гаспадарцы. У пастанове ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб правядзеньні веснавой сяўбы пастаўлена вялізарнейшая праграма падвышэньня ўраджайнасьці. Так, ураджай насьць па збожжавых культурах павінна быць падвышана на 12 проц., па травах і тэхкультурах—на 15 проц., па бульбе на—20 проц.

Для вырашэньня гэтай задачы ёсьць толькі адзіны шлях, гэта шлях аўладаньня і ўжываньня дасягненьняў агратэхнікі.

Ня гледзячы на тое, што па пытаньнях аўладаньня і ўжываньня агратэхнікі мы маем яскравыя дырэктывы,—цэлы рад раённых зямельна-калгасных арганізацый яшчэ не павярнуліся тварам ад практычнага вырашэньня гэтай задачы.

Усе мы добра ведаем, што ўжываньне не штучных угнаеньняў і вапнаваньне зьяўляецца асноўнымі масавымі агратэхнічнымі мерапрыемствамі па падняцьці ўраджайнасьці. Што-ж мы маем на гэтым вучастку работ пяпер на подступах да веснавой сяўбы?

Вапнаваньне прызнана ва ўмовах БССР як самае эфэктыўнае і разам з тым таннае мерапрыемства па падвышэньні ўраджайнасьці. Паводле пляну НКЗВ у гэтым годзе да веснавой сяўбы павінна быць здабыта і перамолата для мэтаў угнаеньня 194.550 тон вапны. У часе веснавой сяўбы павінна быць вывезена і скарыстана саўгасамі 21.235 тон вапны, калгасамі—81.340 тон вапны.

Практыка мінулых год паказала, што плян вапнаваньня можа быць выкананы толькі пры ўмове сваячасовай завозкі вапны саўгасамі і калгасамі ў часе падрыхтоўкі да сяўбы, калі яшчэ стаіць санная дарога. Між тым, паводле звозкі НКЗВ на 1 сакавіка г. т. плян завозкі вапны выкананы саўгасамі на 1,1 проц., калгасамі— на 4,6 проц. а аднаасобнікамі на 0 проц.

Гэтыя лічбы красамоўна сьцьвярджаюць тое, што рад калгасна-зямельных арганізацый ігнаруюць правядзеньне ў жыцьцё асноўных мерапрыемстваў па падняцьці ўраджайнасьці.

Між іншым галоўны спажывец вапны—Белкалгасцэнтр нават не палічыў патрэбным заключыць дагавор з Белсампрамсаюзам на перамол вапны. Склады вапназаводаў Белсампрамсаюзаў перапоўнены вапнай, але ніхто яе не забірае. З гэтае прычыны на сёньняшні дзень спынілі сваю работу, ня выканаўшы праграм, амаль усе вапназаводы БССР.

Ня гледзячы на тое, што да веснавога бездарожжа засталіся лічаныя дні, і па сёньняшні дзень амаль нічога ня робіцца ў большасьці раёнаў па перавозцы ўгнаеньняў, якія валяюцца пад адкрытым небам на станцыях (Смалявічы), альбо ў лепшым выпадку знаходзяцца ў складах (Старобінскі раён).

З рэалізацыяй другіх відаў угнаеньня справа знаходзіцца ня ў лепшым становішчы. Усяго па БССР плян збору попелу выкананы толькі на 25,5 проц., а вывазка гною праведзена на 3,1 проц.

Барацьба за падвышэньне ўраджайнасьці, а гэта азначае, пераводзячы на практычную мову. Масавае ўжываньне такіх агромерапрыемстваў, як угнаеньне і вапнаваньня глебы,— зьяўляецца барацьбой за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў. Таму, факты і практыка недадзоўкі і ігнараваньня задачы ўгнаеньня трэба расцэньваць як недадзоўку арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу. Пад знакам барацьбы з правымі правага апартунізму на гэтым вучастку мы павінны змагацца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за пасьпяховую падрыхтоўку і правядзеньне 3-й бальшавіцкай сяўбы.

Угнаеньне і вапнаваньне—асноўныя масавыя апрамерапрыемствы па барацьбе за высокі ўраджай—за якасьць у сельскай гаспадарцы. На гэты вучастак трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу і арганізаваць перамогу папых пляноў—у гэтым шырока пасьпяховай падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы.

Угнаеньне ляжыць пад адкрытым небам

СМАЛЯВІЧЫ. На станцыі Смалявічы яшчэ ад жніўня мінулага году ляжыць каля 10 вагонаў розных мінэральных угнаеньняў і іх ніхто не забірае. Угнаеньне ляжыць пад адкрытым небам, пад сьнегам і дажджом і таму зьмаралася ў адну груду.

Калгасы — казапэрацыйная сыстэма Смалявіцкага і Чэрвеньскага раёнаў і дырэкцыі саўгасаў правялі поўную бязьдзейнасьць у справе прасоўваньня мінэральных угнаеньняў у калгасы і саўгасы.

Органы пракуратуры павінны прыцягнуць да адказнасьці винаватых у зрыве вывазкі ўгнаеньняў. Б—г.

Браць прыклад з калгасу „Мопр"

ЗАСЛАЎЕ. Калгас «Мопр», Хадасеўскага сельсавету, па ўдарнаму рыхтуецца да сяўбы. Насенфонды поўнасьцю створаны і ачышчаны, с.-г. машыны адрамантаваны, збруя і транспарт напраўлены. Калгас высунуў сустрэчны плян па пасеве ярыны, перавысіўшы кантрольныя лічбы на 18 га.

Калгас сваячасова пачаў вываз мінэральных угнаеньняў. Дзеля гэтага былі выдзелены спэцыяльныя брыгады, які па ўдарнаму выканалі ўкладзена на іх задачы.

Праўленьне калгасу разгарнула збор попелу. Прыняты захады, каб попел належна захоўваўся. Р. Лойнаў.

ЗВОДКА

аб ходзе завозу вапны, зборы попелу і аб вывазцы гною на 1 сакавіка 1932 г.

Назва сэктараў	Завезена вапны проц. вык.	Сабрана попелу проц. вык.	Вывазка гною проц. вык.
Саўгасы . .	1,1	105,4	18,9
Калгасы . .	4,6	31,6	2,8
Аднаасобнікі . .	—	16,4	0.1
Усяго па БССР .	3,9	25.5	3,1

Крычаўскі фасфарытны завод здае тэмпы

КРЫЧАЎ. Фасфарытны завод павінен за першы квартал 1932 г. перамолоць 7.400 тон фасфарытнай мукі. Як-жа ён справіўся з гэтай адказнейшай задачай? Трэба адказаць ясна— дрэнна. З прычыны бязьдзейнасьці Белхімпрому і кіраўніцтва заводу з восені ня была загатоўлена ў патрэбнай колькасьці руда, таму зараз здараюцца перабоі ў рабоце заводу. Пляны па перамоле фасфарыту зрываюцца. У студзені замест 2.000 тон, вызначаных паводле пляну, перамелата 1.692 тоны. Яшчэ горш стаіць справа ў лютым: замест 2.800 тон перамолата толькі... 666 тон.

Белхімпром і мясцовыя арганізацыі павінны забясьпечыць бесперабойную нагрузку заводу. Плян па перамоле фасфарытнай руды павінен быць выкананы ў вызначаныя тэрміны.

К.

Тысячы тон вапны марынуюцца на сялагах

Паводле пляну НКЗБ, сёлета павінна быць здабыта і перамолата для мэт угнаеньня 194.550 ТОН ВАПНЫ, прычым, у час весьняй сяўбы павінна быць вывезена: па лініі саўгасаў 21,235 тон, калгасамі 81,340 тон вапны.

Як відаць з пададзеных вышэй лічбаў, з пачатку зімы трэба было прыступіць да перавозкі вапны, каб выканаць гэту работу па саннай дарозе, бо не тады вавіць угнаеньне, калі дарога сапсуецца. Апрача ўсяго гэтага на час сяўбы нельга адкладваць усе работы.

Ня гледзячы на тое, што практыка мінулых гадоў паказала, што ня трэба пазьніцца з гэтай работай, мы і сёлета маем прарыў у гэтым важнейшым агрэмерапрыемстве. Да гэтага часу плян вывазкі вапны выкананы толькі на 3,9 проц. (саўгасы— 1,1 проц., калгасы — 4,6 проц.).

Белкалгасцэнтр і розныя сельгасабяднаньні яўна ігнаруюць вывазку вапны. Досыць указаць на такі факт, што на сёненні дзень з Белсампрамсаюзам заключыў дагаворы на перамол вапны толькі... дзьве арганізацыі: Насентрэст і Белсалгародтрэст. Белкалгасцэнтр, галоўны спажывец вапны, правяў поўную бязьдзейнасьць у гэтай справе.

68 вапназаводаў Белсампрамсаюзу, паводле вызначанага пляну, маюць заданьне перамолаць на працягу 1932 году для патрэб сельскай гаспадаркі —111,000 тон вапны. Да пачатку веснавой сяўбы павінна быць намолата 60.000 тон. З гэтай задачай заводы могуць лёгка справіцца, але бяда ў тым, што вапну не забіраюць. Склады перагружаны, трашчаць, але спажыўцы не зьбіраюцца забіраць.

Зараз на складах ляжыць да 25.000 тон гашанай вапны, забраці толькі... каля 200 тон.

З прычыны таго, што не забіраюць вапны спыніліся амаль усе вапназаводы. Калі тэрмінова ня будуць ужытыя меры па вывазцы вапны мы стаім перад пагрозай зрыву плянаў па вапнаваньню глебы.

У гэту справу павінны ўмяшацца органы РСІ, трэба дабіцца, каб неадкладна пачалі вываз вапны, не дапускаючы ніводнага дня санай дарогі.

К.

У Старобіне за ўраджайнасьць, „змагаюцца" рэзалюцыямі... а ўгнаеньні ляжаць на складах

СТАРОБІН. Ня гледзячы на тое, што да веснавой бездарожжы засталіся лічаныя дні, у раёнах нічога ня робіцца па перавозцы ўгнаеньня. Калгасаюз ня прымае ніякіх мер, каб калгасы па саннай дарозе перавезьлі вапну і інш. мінэральнае ўгнаеньне, якое вялікімі грузамі ляжыць пад адкрытым небам на станцыі і псуецца.

Замест практычнага апэрацыйнага кіраўніцтва Райкалгассаюз займаецца складаньнем папяровых дырэктыў. Калі зараз ня будуць прыняты стрэгія меры, дык ёсьць пагроза, што ўгнаеньне замест таго, каб спрыяць падняцьцю ўраджайнасьці нашых палёў будзе ляжаць мёртвым капіталам на складах.

Органы РСІ павінны ў тэрміновым парадку заняцца гэтай справай. Вінаватыя ў зрыве перавозкі ўгнаеньня павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

МАЙСКІ

Паведамленьне ТАСС

5-га сакавіка ў 2 гадзіне 10 мінутдню на рагу Леонцьеўскага завулку і вуліцы Герцэна быў зроблены замах на дарадцу нямецкага пасольства пана Твардоўскага, які ехаў з пасольства дадому.

Злачынца зрабіў некалькі стрэлаў з рэвальвэру і нанёс п. Твардоўскаму дзьве раны—адну невялікую на шыі і параненьне нісьці левай рукі з пераломам пасьці. Падасьпеўшымі супрацаўнікамі АДПУ страляўшы быў абязброены і арыштаваны. Затрыманы назваў сябе Іудай Міронавічам Штэрнам. Сьледзтва праводзіцца АДПУ прысьвешаным параўкам.

Пан Твардоўскі праехаў з месца замаху ў Крамлёўскую больніцу, дзе яму аказана мэддапамога.

Зараз-жа па атрыманьні паведамленьня аб замаху нам. народнага камісара па замежных справах т. Крэсьцінскі і загадчык аддзелам Цэнтральнай Эўропы прыбылі ў больніцу і выказалі спачуваньне нямецкаму паслу Дырконэну, які там знаходзіўся, і самаму п. Твардоўскаму.

Партыйнае будаўніцтва

ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЫПАЦЬ НАСЕНФОНДЫ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ

„Савет Нар дных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) указваюць усім партыйным і савецкім арганізацыям на тое, што цэнтральнай задачай іх работы на вёсцы ў бліжэйшыя дні зьяўляецца стварэньне насенных калгасных фондаў у разьмерах неабходных для поўнага выкананьня пасеўнага пляну“ (З пост. СНК СССР і ЦК УсеКП(б)

Работу па стварэньні насенных фондаў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР паставілі як цэнтральную задачу партыйных арганізацый у бліжэйшыя тыдні. Гэтая важнейшая дырэктыва партыі і ўраду вынікае з таго, што насенные адыгрывае рашаючую ролю для сваячасовага пачатку і правядзеньня веснавой сяўбы.

Зусім зразумела, што парт'арганізацыі абавязаны былі кінуць галоўныя свае сілы на гэты рашаючы вучастак падрыхтоўкі да сяўбы.

Мы ва ўмовах БССР маем рад партыйных арганізацый, якія правільна зразумелі вялізарнейшую палітычную важнасьць сваячасовай засыпкі насенных і страхавых фондаў, якія сапраўды бальшавіцкай напорыстасьцю ўзяліся за вырашэньне гэтай адказьнейшай задачы. Такімі раёнамі зьяўляюцца Лепельскі, выканаўшы плян па насенных фондах на 90,2 проц., Мсьціслаўскі—88,3 проц., Чырвона-Слабодскі—82 проц. і г. д.

У выніку канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку партыйных ячэек і сельсаветаў, калгас імя Калініна Чаўскага раёну і калгас «Барацьбіт» Койданаўскага раёну ўжо скончылі за сыпку насенных і страхавых фондаў.

Аднак, на 1-е сакавіка плян стварэньня насенных фондаў па БССР выканан толькі на 53 проц. Гэта значыць, што далёка не ва ўсіх парт'арганізацыях падышлі да гэтай работы з належнай сур'ёзнасьцю. У радзе раёнаў мы маем падмену жывога апэрацыйнага кіраўніцтва работай па арганізацыі засыпкі насенных фондаў агульнымі разважаньнямі, спадзяваньнем на самацёк. Замест разгортваньня масавай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў насеньня, замест разгортваньня сацыялістычнай узаемадапамогі паміж калгасамі, у некаторых мясцох займаюцца разважаньнямі пра адсутнасьць насеньня, спадзяюцца, што насенные прывязуць з іншых раёнаў. Партыйныя ячэйкі часта натуралізуюць гэтым разважаньням, ня бачачы пад імі кулацкай дзейнасьці, накіраванай на зрыў пасеўнай кампаніі, гэта значыць, што далёка не ва ўсіх ячэйках разумеюць, што вакол работы па стварэньні насенных фондаў разгортваецца ўпартая клясавая барацьба.

Тэрміны, вызначаныя партыяй і ўрадам для засыпкі насенных фондаў, канчаюцца. Тое становішча, што на 1-га сакавіка мы выканалі толькі 53 проц. пляну стварэньня насенных фондаў патрабуе ад ўсіх партыйных арганізацый намаганьня ўсіх сіл, разгортваньня шырачэйшай масавай работы сярод калгаснікаў, бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў, патраеньня тэмпаў работы ў гэтым напрамку.

Заціжка ў рабоце па стварэньні насенных фондаў зьвяцца буйнейшай перашкодай сваячасоваму разгортваньню веснавой сяўбы і нанясе ўдар па ўраджайнасьці. Таму на гэты вучастак работы, трэба неадкладна кінуць усе галоўныя сілы партыйных арганізацый.

Узоры апэрацыйнага кіраўніцтва

КОЙДАНАВА. Сельпартком «Вязынь-Фаніпаль» абслугоўвае адзін з буйнейшых у БССР малочна-жывёлагадоўчых саўгасаў, які створаны на плошчы 4.000 га. Саўгас «Вязынь-Фаніпаль» падзяляецца на 4 вытворчых вучасткі: Ружампаль, Нявелічы, Вязынь-Фаніпаль і Вярэжка. Пры кожным вучастку ёсьць партыйная ячэйка, якія па-бальшавіцку ўзначальваюць разгорнутую работу па гаспадарчым умацаваньні саўгасу.

Вытворчы вучастак Вязынь-Фаніпаль мае 695 га плошчы, з якіх пахаці—435 га. Зараз вучастак Вязынь-Фаніпаль, як і ў весь саўгас, заняты падрыхтоўкай да веснавой сяўбы. Падрыхтоўка пачалася яшчэ 1 студзеня. Добрае апэрацыйнае кіраўніцтва гэтай справай з боку партячэйкі мае ўжо свае вынікі: цалкам зчышчана ад сьнегу, падрыхтавана для ўчасьніка 80 тон фасфарытнай мукі і 80 тон сельвеніту, вывезена 1.500 тон гною. Праведзены абмер 4-х тон пратравага ячменю па сартавы. Рамонт інвэнтара праводзіцца ўдарнымі тэмпамі. Цалкам ліквідавана абязьлічка ў дагляндзе за коньмі.

Значная работа праведзена па падрыхтоўцы кадраў для сяўбы. Падрыхтаваны два паляводы, 4 брыгадзіры, 5 трактарыстаў, 1 вучотчык, 2 арганізатары работы. Стала працуе гурток па аўладаньні агратэхнікай, які наведваюць 17 рабочых. Заканчваецца работа па заключэньні дагавораў з калгасамі аб забясьпечаньні рабочай сілай на час сяўбы. Вучастак Вязынь-Фаніпаль заключае дагавор з калгасам «Зьвязда»

Добра разгарнула падрыхтоўку да сяўбы насьцепная газэта. Яна своячасова сыгналізуе аб асобных прарывах, па бальшавіцку змагаецца за ўкараненьне зьдзельшчыны і гаспадарчага разьліку. Па ініцыятыве газэты, зараз заключаюцца дагаворы паміж вучасткамі, цэхамі на лепшае заканчэньне падрыхтоўкі і правядзеньне веснавой сяўбы; разгарнулася работа па заключэньні гаспадарча-разьліковых дагавораў.

Але побач з гэтымі паказьнікамі прыкладнай работы, несьма не адначыць рад недахопаў, якія партыйная ячэйка павінна ліквідаваць у сваёй штодзённай рабоце.

На вучастку няма яшчэ дэталёва-распрацаванага выпворчага пляну весенавых работ. Праміжкова-прагрэсыўная зьдзельшчына не зрабілася яшчэ асноўнай сыстэмай аплаты працы. Ву частак ня цалкам забясьпечаны прычапным інвантаром і запаснымі часткамі для складаных машын. Бранізаваныя фонды на час веснавой сяўбы ня створаны.

Партыйная ячэйка вучастку таксама не занялася яшчэ пытаньнем стварэньня культурных умоў, якія-б спрыялі пасьпяховаму правядзеньню веснавой сяўбы. Ясьлі ня выхтуюцца для прыёму большага ліку дзяцей. Хата-чытальня не працуе. Недастаткова яшчэ разгорнуты ўдарніцкі рух. Ударніцтвам ахоплена толькі 25 проц. рабочых.

Своячасовае выпраўленьне гэтых недахопаў забясьпечыць, сапраўды бальшавіцкае, правядзеньне трэцяй бальшавіцкай сяўбы на вучастку Вязынь-Фаніпаль.

Тупіцкі.

Агідны факт зьнішчэньня насеньня

ВЕТКА, 2-III. Нарыхтаванае райнасенканторай насеньне для веснавой сяўбы трымаецца ў неданушчальных умовах. Усе склады, дзе захоўваецца насеньне, не абсталяваны.

Адзін са складаў з вікай і насеньнем гародніны прылягае да ледніка і пры цёплым надворч'ю складзе будзе вялікая вільгаць. Склад № 2 зусім не абсталяваны: у сьценках не заканапачаны вялікія шчыліны. Сьнег дзьме проста на насеньне. Ня ўжыты захады, каб уніканць зьмешваньня розных культур насеньня, насеньне перасыпаецца і перамешваецца.

Адзін са складаў для захаваньня насеньня знаходзіцца ў памяшканьні, дзе раней саліліся скуры.

Адпаведныя арганізацыі раёну свае часова не зьвярнулі на гэта ўвагі. Вольныя склады Саюзхлебу, якія больш прыстасаваны для захаваньня насеньня, ня былі выкарыстаны. Кожная хвіліна марудзьнасьці ў перакідцы насеньня ў іншыя склады пагражае псаваньнем насеньня на тысячы рублёў. Канкрэтныя вінаўнікі гэтага агіднейшага зьнішчэньня насеньня павінны быць прыцягнуты да судовай адказнасьці.



ВЕТКАЎСКІ СПОСАБ ЗАХАВАНЬНЯ НАСЕНЬНЯ.

(БелТА).

Плян засыпкі насенфондаў выкананы

Чавусы. Пад кіраўніцтвам сваёй партыйнай ячэйкі, калгас імя тав. Калініна, поўнасьцю закончыў работу па засыпцы насеннага і страхавога фондаў.

Пры абгаварэньні пляну пасеву калгаснікі высунулі сустрэчны плян пашырэньня пасеўнай плошчы за лік скарачэньня папару. Замест вызначаных плянам 28 га бульбы, калгас імя тав. Калініна мяркуе засеяць 35 га. Насеньнем калгас забясьпечаны і яно ўжо цалкам зчышчана.

Поступ падрыхтоўных работ да сяўбы ў калгасе разгорнуты добра. Сельска-гаспадарчы інвэнтар адраман таваны, закончваецца рамонт цялег. Сабрана 4 тоны попелу для ўчасьніка, збор яшчэ працягваецца. Ударна працуе брыгада па вывазцы гною,—ужо вывезена больш 23 тон. Калгас імя тав. Калініна выклікаў на сацспаборніцтва іншыя калгасы Чаўскага раёну.

Партыйная ячэйка калгасу штодзённым апэрацыйным кіраўніцтвам забясьпечыла ўдарную работу па выкананьні важнейшых партыйных дырэктыў.

Г. Ц.

Аб дальнейшай рабоце Цэнтральнай камісіі па чыстцы савецкага апарату

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ

Прапанаваць ЦК ЧСА і мясцовым органам гарадзкіх і раённых РСІ на прадстаячы пэрыяд, у зьвязку з задачай перабудовы работы апарату пановаму, у далейшай рабоце па чыстцы—кіравацца наступным:

а) Далейшая праверка і чыстка савецкага апарату павінна праходзіць не ў парадку кампаніі, а зьяўляецца штодзённым арганічным мэтадам работы КК-РСІ, прычым у далейшым праводзіць чыстку савецкага апарату толькі на тых вучастках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, дзе дрэнна выконваюцца заданьні партыі і ўраду і дзе гэтае невыкананьне пляну яўна сьведчыць аб няпрыгоднасьці людзей, аб недахопах структуры і сыстэмы работы данай установы (арганізацыі), часткі яе, або асобнай групы работнікаў, адказных за выкананьне таго ці іншага заданьня

Такая ўстаноўка ўжываецца і да ўстаноў ужо прайшоўных чыстку апарату, прычым чыстку прадаўжаць ня толькі пад кутом погляду выгнаньня з апарату чужых абюракраціўшыхся і ня ўмеючых пасьлядоўна праводзіць палітыку партыі работнікаў, але і ў мэтах праверкі сыстэмы работы і структуры апарату, перабудовы яго работы па-новаму.

б) Абавязаць гарадзкія і раённыя КК-РСІ праверку і чыстку праводзіць толькі пры наяўнасьці ўказаных у п. «а» даных, а таксама заяў бюро скаргаў, грамадзкіх арганізацый, асобных рабочых, калгаснікаў, газэт, пра ктыкуючы праверку асобных частак апарату, ці груп работнікаў і нават асобных работнікаў, ужываючы ў гэтых выпадках мэтады прыцягненьня шырокага актыву і шырокай пралетарскай гласнасьці.

в) Прапанаваць ЦК ЧСА, гарадзкім і раённым КК-РСІ пры ўжываньні II і III катэгорыі—абавязкова абмяжоўваць поўным тэрмінам (ад году да 3 год), пасьля якога спагнаньні зьнімаюцца пры ўмовах станоўчых водзываў аб рабоце в боку адміністрацыі і грамадзкіх арганізацый.

Для вычышчаных раней па II і III катэгорыям—без ўказаньня тэрміну, гэты тэрмін павінен быць устаноўлены па іх заявах мясцовымі камісіямі па чыстцы, або раённымі і гарадзкімі КК-РСІ.

4. Абавязаць мясцовыя КК-РСІ, пад адказнасьць старшынь, забясьпечыць своячасовую прысылку ўсіх матар'ялаў, як справаздачнага характару, так і матар'ялаў характарызуючых практыку чысткі і праверкі апарату, ўсклаўшы на ЦК ЧСА адказнасьць за своячасовую адсылку такіх-жа матар'ялаў у ЦК ЧСА СССР.

5. Прапанаваць усім кіраўнікам апэрацыйных груп наркамату, бюро скаргаў—у дэкадны тэрмін прадставіць у ЦК ЧСА свае прапановы аб чыстцы асобных зьвеньняў, альбо частак цэнтральных апаратаў, якія ня выконваюць дырэктыў партыі і ўраду, альбо ў выніку работы якіх выявіцца прарыў у рабоце ўстановы.

6. Прапанаваць гарадзкім і раённым КК-РСІ (Менск, Гомель, Віцебск, Бабруйск, Мазыр, Магілеў, Ворша, Полацк)—арганізаваць камісіі па чыстцы па прынцыпу арганізацыі ЦК ЧСА, але ня менш 7 асоб, з абавязковым членствам у камісіі рабочых і калгаснікаў. У астатніх раёнах арганізоўваць камісіі па меры неабходнасьці самай чысткі апарату, абавязаўшы КК-РСІ прадставіць у дэкадны тэрмін у ЦК ЧСА персанальны склад камісіі: ЦК ЧСА ўсіляць жывое кіраўніцтва—шляхам інструктаваньня іх работы заслухоўваньнем дакладаў на паседжаньнях ЦК ЧСА.

7. Даручыць ЦК ЧСА распрацаваць плян работы прадставіўшы яго ў дэкадны тэрмін на зацьверджаньне наркому, або намесьнікаў, улічыўшы, што на бліжэйшы пэрыяд ЦК ЧСА павінны зьвярнуць увагу на праверку выкананьня пастаноў камісіі па чыстцы.

Старшыня ЦКК КП(б)Б,
Наркам. РСІ БССР КАЛНІН.

Усебеларускі фінпаход

ДА КАНЦА ТРЭЦЯГА ЭТАПУ ЗАСТАЛАСЯ АДНА ДЭКАДА

НАПРУЖЫЦЬ УСЕ СІЛЫ, УСЮ ЭНЭРГІЮ НА ВЫКАНАНЬНЕ ФІНПЛЯНУ

Чырвоная дошка

раёнаў, занесеных Усебеларускім Штабам Фінпаходу

Назва раёнаў	Проц. вык. фінпл. на 20-II	Проц. вык. фінпл. на 1-III
Тураў	86,5	102,5
Гомель	53	69,3
Стродіна	58,6	66,8
Старобін	53,3	65,9
Заслаўе	45	65
Мсьціслаў	53,8	64,1
Мазыр	49,4	62,6
Менск	49	60
Віцебск	52	60,4

Чорная дошка

раёнаў, занесеных Усебеларускім Штабам Фінпаходу

Назва раёнаў	Проц. вык. фінпл. на 20-II	Проц. вык. фінпл. на 1-III
Старыя Дарогі	22,5	27,3
Лельчыцы	20,4	31,6
Уваравічы	22,2	31,6
Асьвея	23,1	31,3
Расоны	26,1	31,3
Талачын	28,4	32,2
Лоеў	29	34,4
Вушачы	27,9	36,4
Камарын	—	41,6

Бабруйшчына яшчэ не дабілася належнага пералому

БАБРУЙСК, (Наш кар.) Бабруйскі раён, перавыканаў фінплян чацьвертага кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі. У першым квартале чацьвертага заключнага году пяцігодкі раён здаў свае пазыцыі. Супакоіўшыся на выніках мінулага году гарадзкія і раённыя арганізацыі, пакаліся цалкам на самацёк у справе мабілізацыі сродкаў, і ў выніку чаго на 1 сакавіка квартальны плян мабілізацыі сродкаў па раёне выкананы на 51 проц.

Райколгасаюз, ня гледзячы на неаднаразавыя сыгналы газэты «Савецкая Беларусь» і мясцовага друку яўна ігнаруе гэтую справу, выканаўшы плян на 20 лютага толькі на 5,1 проц. Ня лепшая справа і з райспажывсаюзам, які выканаў квартальны плян толькі на 11 проц. Гарсавет, Гаржылсаюз свае пляны выканалі на 18 проц.

Тарфарабкоп, Рыбкапсаюз зусім бязь дзейнічаюць у мабілізацыі сродкаў. На тарфрабкопе выкананьне пляну на 20 лютага дасягае толькі 1,5 проц., а па рыбсаюзе—0 проц.

З сельскіх саветаў праяўляюць яўную бязьдзейнасьць, Казуліцкі, Падрэцкі; **Багушэўскі; Продзьвінскі; Каменскі, Лешчанскі;** і рад іншых. Нагул квартальны фінансавы плян па вёсцы выкананы толькі на 22 проц. Асабліва ганебна ідзе паступаньне збору на жыльлёвае і культурнае будаўніцтва. У той час, як да 15 лютага павінна было паступіць ня менш 50 проц. збору, паступіла ўсяго 25,—30 проц.

Надзвычайна кепска ідзе рэалізацыя пазыкі. Тлумачыцца гэта тым; што мясцовыя партыйныя і профсаюзныя арганізацыі, а таксама і камісіі садзейнасьці не аддаюць гэтай справе належнай ўвагі. Гэта яскрава сьведчыць напрыклад, такі факт, што па адным беларэўным цэху дрэваапрацоўчага камбіната да апошняга часу ня было ахоплена падпіскаю на пазыку больш 200 рабочых. Такое становішча і па іншых цэхах камбінату.

У апошні час пачалася самаправерка ходу работы па мабілізацыі сродкаў на прадпрыемствах. Прадпрыемствы наладжваюць узаемную праверку.

Ударнымі тэмпамі разгортваючы работу Бабруйшчына павінна ліквідаваць сваё адставаньне.

А. Дамброўскі:

Да трэцяй бальшавіцкай вясны цалкам рэал заваць акцыі Трактарацэнтру

Крутога пералому ў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру па БССР яшчэ ня наглядаецца. На 20-га лютага квартальнае заданьне выкананa ўсяго толькі на 29,9 проц. супроць 24,9 проц. на 10-га лютага. Такім чынам, за дэкаду выкананьне заданьняў павялічылася ўсяго на 5 проц. Тэмпы зусім нездавальняючыя.

Ганебнае адставаньне БССР у рэалізацыі акцый тлумачыцца тым, што пераважная частка раёнаў у гэтай кампаніі праяўляюць бязьдзейнасьць. Рад рёнаў і на сёньняшні дзень не зразумеў важнасьці, своячасовай рэалізацыі акцый. Кантроль за рэалізацыяй акцый ў радзе месц яшчэ не наладжаны. Райкалгассаюзы, Райза і МТС не разгарнулі адпаведнай масавай работы сярод калгасьнікаў, бяднякоў, сераднякоў аднаасобнікаў.

З прычыны адсутнасьці масавай работы ў радзе калгасаў пануюць шкодныя думкі аб тым, што калгасам ужо непатрэбны трактары, што яны могуць абыйсьціся з наяўнымі сельскагаспадарчымі машынамі. У другім выпадку недаацэньваецца аднаасобны сэктар. Многія з раённых работнікаў разважаюць аб тым, што зараз няма чаго дапамагаць аднаасобнікам у падняцьці іх гаспадаркі, нават праз МТС таму непатрэбна рэалізаваць акцыі Трактрацэнтру па аднаасобным сэктары (Крупскі, Талачынскі і інш. раёны).

Разам з гэтым трэба адзначыць, што некаторыя партыйныя арганізацыі гэтай справе не надаюць адпаведнай увагі. Спробам зрыву справы рэалізацыі акцый партячэйкамі не даецца рашучага адпору.

Калегія Наркамзему яшчэ 10-га лютага катагарычна прапанавала загадчыкам Райза, старшыням райкалгассаюзу і дырэктарам МТС Вушацкага, Горацкага, Гарадоцкага, Крупскага, Вузьдзенскага, Клімавіцкага, Койданаўскага, Чырвона-польскага, Лельчыцкага, Лоеўскага, Любаньскага, Пасыцкага, Тураўскага і Магілеўскага раёнаў у самы бліжэйшы час прыняць меры да поўнага выкананьня заданьняў па рэалізацыі акцый. Прайшло ўжо ня мала часу, а гэтыя раёны ўсё яшчэ не дабіліся належных вынікаў. Квартальнае заданьне да 20-га лютага яны выканалі на 20—35 проц.

За бязьдзейнасьць у рэалізацыі акцый, Беладдзяленьне Трактарацэнтру спыніла завоз трактароў у Гомель, Рэчыцу, Бялынічы. Аднак гэтыя раёны не ўзялі яшчэ ўдарных тэмпаў у рабоце з тым, каб дабіцца карэннага пералому ў рэалізацыі акцый і дабіцца атрыманьня трактароў.

Ганебнае адставаньне ў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру павінна быць ліквідавана. Трэба ўзьняць бальшавіцкую барацьбу за своячасовую рэалізацыю акцый і гэтым самым паскорыць будаўніцтва МТС. Вясна з кожным днём набліжаецца. Бальшавіцкую вясенняю пасеўную кампанію трэба правесьці па ўдарнаму. Зусім зразумела, што без сельска-гаспадарчых машын, асабліва без трактароў, пасеўкампанію нельга правесьці з поўным посьпехам.

Партыйныя арганізацыі павінны рэалізацыю акцый ўзяць пад свой непасрэдны кантроль і ў бліжэйшыя дні дабіцца рэзкага пералому.

Рагаткі, што перашкаджаюць пасьпяховаму выкананьню пляну павінны быць зламаны. На аснове шырока разгорнутай арганізацыйна - масавай работы, на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва кожны раён, сельсавет і калгас павінен заваяваць перамогу ў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Калінкавіцкі гарсавет перавыканаў фінплян

МОЗЫР. (Белта). Калінкавіцкі гарадзкі савет выканаў квартальны плян мабілізацыі сродкаў на 25-га лютага на 102,6 проц. Заданьне па фізычным укладаньнях у ашчадкасы выкананa на 110,4 проц., па паёх пажыўка апэрацыі—на 111 проц., па ўзносах па пазыцы «3-ці рашаючы»—101,8 проц. і г. д.

Калінкавіцкі гарадзкі савет узяў на сябе абавязацельствы па вацумову з Петрыкаўскім гарадзкім саветам по насьцю выканаў. Вакол пытаньня мабілізацыі сродкаў мабілізавана пралетарская грамадзкасьць, усе члены гарадзкога савету прымацаваны да адпаведных вучасткаў па горадзе.

Клімаўскі раён павінен выканаць вацумову

Клімавічы. (Наш кар.). Клімавіцкі раён уступіў у чацьверты заключны год пяцігодкі з буйнымі прарывамі ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. Фінплян першага кварталу на 1-га сакавіка выкананы ўсяго на 45 проц.

Масавая работа па фінпляне ў раёне не разгорнута. Сацыялістычныя мэтады: сацспаборніцтва і ўдарніцтва ня ўжываюцца. Стаўка фінансавага актыву ў раёне няма.

Асабліва адстае ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў райкалгассаюз. Ён і да сёньняшняга дню па матавых і наявых тэмпах не сабраў ніводнай капейкі. Таксама нагадваецца па вялікі прарыў на сьнезным райашчадкасы, дзе замест выкананьня пляну—адыйшоў на ўкладаньнях на 3.400 руб.

З сельсаветаў асабліва адстаюць Гарацэвіцкі, які фінплян першага кварталу выканаў толькі на 7,6 проц. Катовіцкі—8,3 проц., Зьвонкацкі—12,4 проц., Дубровіцкі—13,4 проц. і інш.

Разам з гэтым ёсьць сельсаветы, якія па-бальшавіцку змагаюцца за фінплян. Так, Студзеніцкі, Алтахоўскі, Забяшчанскі сельсаветы ўжо падыходзяць да 100 процантнага выкананьня пляну першага кварталу.

П. Кавалёў.

Пустынскі сельсавет ганебна адстае

У выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў Пустынскі сельсавет, Сеньненскага раёну, яшчэ ня мае рашучага пералому. Фінплян першага кварталу на 20-га лютага выкананa толькі на 32,6 проц.

Паказьнікі па выкананьні пазасобных відаў мабілізацыі сродкаў надзвычайна мізэрныя. Так, па сельпрадаткоўцы плян выкананa усяго на 50 проц., па страхоўцы—на 34 проц., па самаабкладаньні—на 30 проц., па ўкладаньнях у ашчадкасы—на 3 проц., па культэборы—5 проц. і г. д.

Адставаньне Пустынскага сельсавету ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў тлумачыцца тым, што ў сельсавеце не разгорнута адпаведная масавая работа. Фінансавы паход належнага эруху ў выкананьні фінпляну не зрабіў. Працоўныя масы на правядзеньне фінансавага паходу не мабілізаваны.

Пустынскі сельсавет павінен павесьці барацьбу за поўнае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў у вызначаны тэрмін.

Б. Зяневіч.

С. Кудзінаў

Важнейшае зьвяно калгаснай вытворчасьці

Правільная арганізацыя калгаснай працы, барацьба за стварэньне новай сацыялістычнай дысцыпліны і сацыялістычных форм працы (сацспаборніцтва і ўдарніцтва)—адно з цэнтральных рашаючых зьвеньняў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Рашэньне гэтай задачы непасрэдна ўпіраецца раней за ўсё у плянаваньне працы, у правільную расстаноўку працоўнай сілы калгасаў ня толькі ў гаспадарцы, або ў поўнай галіне гаспадаркі гэтых калгасаў, але ўнутры асобнай вытворчай адзінкі—брыгады.

Зьяўляючыся часткай гаспадарчага арганізму ў цэлым, калгасная брыгада, разам з тым, ёсьць поўная вытворчая адзінка, якая адказвае за вынікі, за якасныя і колькасныя паказьнікі сваёй дзейнасьці, якая і ўдасканальвае і паляпшае адзінкі пляну усяго калгасу. На практыцы ўсіх лепшых калгасаў—брыгадная форма арганізацыі працы дала надзвычайна добрыя паказьнікі.

Брыгада зьяўляецца тэй формай арганізацыі працы, якая найлепш забясьпечвае рашэньне галоўнейшай задачы сельскай гаспадаркі—падвышэньне ўраджайнасьці; брыгада таксама садзейнічае выкарчоўваньню абязьлічкі дробна-ўласьніцкіх рвацкіх тэндэнцый.

Значыць, брыгадную форму арганізацыі працы ў калгасах мы павінны прасоўваць у шырокія калгасныя масы, бязумоўна—з улікам эканамічных і іншых асаблівасьцяй раёнаў і самых калгасаў.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 4-II-32 г. аб чарговых мерапрыемствах арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, падкрэсьліла, што «важнейшым зьвяном у арганізацыі працы ў калгасах павінна стаць брыгада».

Калі яшчэ ў мінулым годзе ў шэрату калгасаў прыходзілася даказваць калгаснікам, што пабрыгадна лепш працаваць, чым «мірам», што без норм выпрацоўкі і бяз зьдзельшчыны калгасная вытворчасьць ня можа расьці і разьвівацца, дык ужо зараз кожны калгаснік стаіць за абавязковае ўвядзеньне норм выпрацоўкі, за зьдзельшчыну, за брыгадны спосаб работы ў калгасах.

У ЧЫМ ШКОДНАСЬЦЬ БРЫГАДЫ-ДВОРКІНА.

Аднак калгаснае сялянства ў значнай сваёй частцы не асвоіла ў дастатковай меры гэтыя формы арганізацыі калгаснай працы. На практыцы да гэтага часу наглядаецца—цэлы рад скажэньняў асноўных мэтадаў арганізацыі працы ў калгасах.

Так, напрыклад, былі выпадкі арганізацыі брыгад па тэрытарыяльнай адзнацы—гэта значыць брыгад-дворак. Гэтыя брыгады-дворкі зьяўляюцца шкодным формай арганізацыі працы ў калгасах, якая не задавальняе патрабаваньняў калгаснай вытворчасьці, не дае магчымасьці правільна расставіць людзей, рабочай жывёлы і машын паміж брыгадамі.

Брыгада-дворка выключае спэцыялізацыю, перашкаджае арганізацыі адыходніцтва і г. д. Нажаль яшчэ ў мінулую пасеўную кампанію шмат калгасаў у радзе раёнаў не амаглі правільна арганізаваць брыгады. Паводле вестак ад 5.585 калгасаў БССР відаць, што ў часе веснавой сяўбы з гэтай колькасьці калгасаў былі арганізаваны брыгады-дворкі па 886 калгасах, а па 386—былі арганізаваны спэцыялізаваныя брыгады і брыгады-дворкі разам.

Такім чынам у 22,7 проц. усіх гэтых калгасаў існавалі брыгады-дворкі, якія перашкаджалі падвышэньню вытворчасьці калгаснай працы.

Калгасная практыка паказала, што, як правіла, ніводная брыгада-дворка ня здолела цалкам выкарыстаць наяўную рабочую сілу, коняй і с.-г. інвэнтар тых калгасаў, дзе былі арганізаваны брыгады-дворкі. У гэтых брыгадах, з прычыны направільнай іх арганізацыі, наглядаецца слабы выхад калгаснікаў на работу і слабое скарыстаньне рабочай сілы саміх калгаснікаў.

Так, напрыклад, у калгасе імя Карла Маркса (Дубровенскі раён) у мінулым годзе ў сакавіку вышла на работу толькі 24 проц., у лістападзе—59 проц., у верасьні—51 проц. у кастрычніку—21 проц. працаздольных калгаснікаў.

Пры такім невыстарчальным выхадзе на працу ў калгасе—працоўнасьць працы калгаснікаў была вельмі нізкай: па радзе работ норма выпрацоўкі сыстэматычна ня выконвалася.

Адсюль трэба самым рашучым чынам павесьці барацьбу з брыгадай-дворкай, барацьбу за перабудову брыгад па вытворчым прынцыпе.

АСНОЎНЫ ЎПОР — НА СТАЛУЮ БРЫГАДУ ПА ВЫТВОРЧЫМ ПРЫНЦЫПЕ.

Усе брыгады ў калгасах павінны быць пабудаваны выключна па вытворчым прынцыпе, са сталым складам, са спэцыяльным улікам і падборам калгаснікаў для гэтых брыгад, іх кваліфікацыі, у адпаведнасьці з характарам даручанай гэтым брыгадам вытворчай работы.

Замацаваньне за брыгадай пэўных вучасткаў, прымацаваньне да гэтай брыгады ў часе кампаній інвэнтара, с.-г. машын і транспартных сродкаў—важнейшая ўмова ліквідацыі абязьлічкі ў калгасах.

Толькі брыгада са сталым складам калгаснікаў, да якой на ўвесь час работы прымацоўваюцца машыны, рабочая жывёла, за якія гэтая брыгада нясе поўную адказнасьць, зможа найлепш забясьпечыць ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна ў калгасах, ліквідацыю цякучасьці, абязьлічкі, урабнілаўкі, падвышэньне кваліфікацыі калгаснікаў і г. д.

У мінулую веснавую пасеўную кампанію з 5.585 калгасаў на 1-VI-31 г.—1.407 калгасаў зусім не замацоўвалі коняй ні за брыгадамі, ні за пазасобнымі калгаснікамі ўнутры брыгад. У гэтай справе панавала абязьлічка.

Яшчэ больш дрэнная справа была з ліквідацыяй абязьлічкі ў жывёлагадоўлі: 2.306 калгасаў, або 41,3 проц., зусім не замацавалі, напрыклад, кароў за даяркамі.

На барацьбу з абязьлічкай парт'ячэйкі і праўленьні калгасаў павінны мабілізаваць усю калгасную грамадзкасьць.

Для поўнай ліквідацыі абязьлічкі рабочай жывёлы—трэба гэтую жывёлу прымацаваць да адпаведных калгаснікаў, якія павінны працаваць на гэтай жывёле стала ўвесь пэрыяд сельска-гаспадарчых работ, несьці адказнасьць за стан, догляд і кармленьне. Кожны конь павінен мець свой нумар, клічку, прымацаваную да яго збрую, транспарт, машыны.

НЕ СТВАРАЦЬ ГРАМОЗНЫХ БРЫГАД.

Колькасьць калгаснікаў, наяўнасьць цягавай сілы і інвэнтар у кожнай вытворчай брыгадзе ў гэтую веснавую пасеўную кампанію павінна быць разьлічана выходзячы з найбольшага падвышэньня прадукцыйнасьці працы, правільнага выкарыстаньня коняй і машын, і правядзеньня работ пры максымальным скарачэньні тэрміну веснавой сяўбы.

Практыка мінулага году пацьвердзіла, што найбольш мэтазгоднымі і прыстасаванымі да калгаснай вытворчасьці аказаліся брыгады з невялікім складам—у сярэднім 20-25 чалавек (у залежнасьці ад культуры, галін гаспадаркі, характару работы, складу машын і цягавай сілы).

У аснову ўсёй работы калгасаў павінны быць пакладзены добра распрацаваныя, даведзеныя да кожнага калгасніка вытворчыя пляны. У строгай адпаведнасьці з вытворчымі плянамі і павінны будавацца калгасныя брыгады.

Трэба рашуча не дапускаць перакідкі брыгад ня выканаўшых свайго вытворчага заданьня з аднаго вучастку на другі, а таксама перакідку пазасобных калгаснікаў і цягавай сілы з брыгады ў брыгаду.

Трэба, каб брыгада матар'яльна адказвала за посьпехі сваёй работы. Гэта адказнасьць павінна выражацца ў тым, што ацэнка працадню павінна падвышацца, або зьнижацца ў залежнасьці ад пасьпяховасьці работы брыгады.

ПАШЫРАЮЧЫ ВЫТВОРЧУЮ ГІБКАСЬЦЬ ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА СТАЛАСЬЦІ АСНОЎНАГА ЯДРА БРЫГАД.

Мы дагэтуль маем яшчэ зусім невялікі вопыт арганізацыі сталых брыгад у калгасах. Аднак, гэты вопыт паказвае, што сталыя брыгады на даным этапе калгаснага будаўніцтва стваряюць усе ўмовы для таго, каб значна падвысіць у калгасах працоўную дысцыпліну і прадукцыйнасьць працы.

Аднак, стварэньне сталых брыгад яшчэ не гаворыць за тое, што ўсе калгаснікі ў кожным калгасе пры ўсякіх умовах павінны быць на ўвесь год адразу разьмеркаваны па брыгадах. Гэта таксама не азначае, што створаны склад сталай брыгады на ўвесь год павінен заставацца нязьменным. Гэта было-б сур'ёзнай памылкай. Нельга зьмяшаць манэўравую гібкасьць калгасных брыгад. У розных сельска-гаспадарчых пэрыядах можа патрабавацца розная колькасьць калгаснікаў, якія працуюць на адным і тым-жа вытворчым вучастку. Так, напрыклад, у часе ўборкі бязумоўна патрабуецца больш людзей, чым пры засеве, або пры ворыве.

Асноўная задача заключаецца ў тым, каб забясьпечыць у брыгадзе сталае ядро з асноўных работнікаў. Трэба забясьпечыць на круглы год гэтае ядро калгаснікаў.

У залежнасьці ад асаблівасьцяй кожнага калгасу, ад ступені яго арганізаванасьці і разьмеру, у выпадку немагчымасьці замацаваць брыгады за вучасткамі на ўвесь год, трэба прымацоўваць гэтыя брыгады да вучасткаў на асобныя пэрыяды сельска-гаспадарчай работы (ворыва, уборка і г. д.). Гэта даволі яскрава паказана ў пастанове ЦК УсеКП(б) ад 4-II «пра чарговыя мерапрыемствы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў».

БРЫГАДЗІР—АРГАНІЗАТАР КАЛГАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ.

Надзвычайна важную ролю ў рабоце брыгады адыгрывае брыг

Недахоп у грубых кармох папоўніць сенам з гальля

ЗАГАТОВІЦЬ 50.150 ТОН КОРМУ З ГАЛЬЛЯ

(З ПАСТАНОВЫ КАЛЕГІІ НКЗБ)

У мэтах павялічэння кармовых рэсурсаў і падсілачнага матар'ялу неабходных для развіцьця жывёлагадоўлі і ліквідацыі дэфіцыту грубых кармоў у пасобных раёнаў,—Калегія НКЗБ пастанаўляе:

Абавязаць дырэктароў трэстаў, старшынь райза і райкалгасаюзаў, дырэктароў МТС, саўгасаў і старшынь калгасаў зараз-жа прыступіць да арганізацыі загатовак корму з гальля дрэў і кустаў лясьцяных парод.

Усяго загатовіць 50.150 тон корму з гальля. Пасобныя арганізацыі павінны загатовіць корму з гальля ў наступных разьмерах: Малочна-прамысловы трэст—6.000 тон, Садовагародны трэст—1.000 тон, Птушкатрусаводны трэст—500 тон, Сьвінаводтрэст—10.000 тон, Насентрэст—3.000 тон, Племтрэст—200 тон чавукова-дасьледчыя ўстановы—100 тон, Беллёнажанплявадтрэст—2000 тон, Белсельгасаб'яднаньне—4.000 тон, палявічны саюз—50 тон, НКЮ—100 тон, Белкалгасцэнтр—25.000 тон.

Даручыць сэктару жывёлагадоўлі НКЗБ і Калгасцэнтру ў пяцідзённы тэрмін выдаць падрабязную інструкцыю па загатоўцы і скарыстаньні корму з гальля і ўстановіць забясьпечаньня ў ім саўгасаў і калгасаў.

Калгасцэнтр і жывёлагадоўчыя трэсты павінны паклапаціцца аб падачы заявак Сельдзяржснабу на набыцьцё дадатковых прыладаў да маючыхся ў іх сілосарэзак сыстэмы «Інтэрнацыянал» і «Папека» для рэзкі гальля. Сельгаснаб павінен неадкладна даць заказ прамысловасьці на выраб патрэбных частак да сілосарэзак.

Паставіць пытаньне перад Лесбелам аб дазволе скарыстаць гальлё дрэў лясьцяных парод з лясоў дзяржаўнага значэньня, а таксама даць адпаведныя ўказаньні сваім леспрамгасам аб адводзе спэцыяльных вучасткаў для загатоўкі корму з гальля.

З мэтаю хутчэйшага правядзеньня гэтага мерапрыемства ў жыцьцё і за наймленьня шырокіх мас саўгасаў і калгасаў з загатоўкай корму з гальля, па Малочна-прамысловым трэсьце, Сьвінаводтрэсту і Калгасцэнтру арганізаваць 3-хдзённыя курсы-нарады па загатоўцы драўлянага корму і подсьцілу.

КУЛАК РАЗБАЗАРВАЕ КАЛГАСНЫЯ КАРМЫ

У калгасе імя Фалько Грышанскага сельсавету, Менскага раёну, нагляда-юцца абураючыя адносіны да захаваньня кармоў. Праўленьне калгасу не паладзіла строгага кантролю за жаномным выдаткаваньнем кармоў, ее на і салома складзена ў пасобных пуніх і ніхто ня сочыць за тым, каб яны не расьцягваліся.

Асабліва агідна пастаўлена справа з кармамі, якія знаходзяцца ў гумне «калгасьніка» Калошы-цьвёрда-задань іка. Калоша зусім не клапоціцца пра замацаваньне калгаснай гаспадаркі, а наадварот, імкнецца разбурыць яе. Усе кармы Калоша выкарыстоўвае выключна для сваёй жывёлы, яму мала было карміць сваіх уласных дзьвюх кароў, дык ён узяў на прагорм карову сваёй дачкі.

Справай разбазарваньня кармоў у калгасе імя Фалько павінны заняцца органы РайРСІ. Цьвёрдазаданьніка Калошу трэба вычысьціць з калгасу.

П. Ч.

ЗАБРАНІРАВАЦЬ ФУРАЖНЫ ФОНД

У саўгасе імя Лекерта (Менск) ёсьць 79 коняй, з якіх 69 працаздольных. Коняй ня рыхтуюць да сэўбы, у даглядзе за імі не ліквідавана абязьлічка.

Кармы выдаюцца нерацыянальна. Сена кідаюць коням пад ногі. Паіць коней ганяюць на рэчку, між тым як саўгас мае водапровад і нават можа арганізаваць водапой коней у стайні. У часе работы не шануюць коней, ганяюць іх да поту, у выніку гэтага коні хварэюць.

Адміністрацыя саўгасу не паклапацілася аб тым, каб забраніраваць на весьнавыя работы патрэбныя фуражныя фонды. Зусім няма канцэнтраваных кармоў.

Таксама нічога ня зроблена па прывядзеньні ў парадак абруі.

Рабкор.

Вопыт перадавых не падхоплены

ДУБРОЎНА. Лёназагатоўкі па раёне праходзяць самацёкам. Багаты вопыт у барацьбе за лён Лядзянскага і Сазонаўскага сельсаветаў не перанесены ў практычную работу ўсіх сельсаветаў і калгасаў, ён ня стаў здабыткам змаганьня за лён.

У той час, калі перадавыя сельсаветы выканалі і перавыканалі пляны лёназагатовак, Сьветашыцкі сельсавет ледзь выканаў плян на 50 проц. Калгасы «13 годзьдзе Чырвонай арміі», імя Блюхера, Новае Барадзіно, імя Будзённага, «Расьсьвет» здалі тонны ацрацоўкі лёну. У калгасах не скарыстоўваюцца рацыянальна лёнамялкі, яны бываюць нагружаны ня больш 6-7 гадзін у суткі, ня былі арганізаваны брыгады на апрацоўку лёну. Старшыня калгасу «Новае Барадзіно» Крыўка выключаны на апрацоўку лёну брыгады пасьлае перабраць буль бу. У калгасе «Расьсьвет» калі 25 тон прасты ніце, у той-жа час 12-ці нарвальная мяжка поўнасьцю не нагружана і працуе ня больш 7-мі гадзін у суткі, драўляныя мяжкі зусім ня выкарыстоўваюцца. Гэтыя калгасы разьмеркавалі на спажывецкія патрэбы калі 35 цнт. лепшага валакна.

Ня лепшая справа па апрацоўцы лёну і ў Цілявіцкім сельсавеце, дзе плян па загатоўках выкананы ўсяго на 20 проц. Сельсавет прымірыцца ад носіцца да кулакоў-заможнікаў, у выніку чаго плян загатовак па цьвёрдых заданьнях выкананы ўсяго на 21 проц. Старшыня сельсавету Жалязоўскі хаўрусуе з кулакамі. Партячэйка таксама праяўляе поўную бязьдзейнасьць і ня прымае належных мер да паслеяньня лёназагатовак. Рад калгасаў («Перамога», «Чырвонармеец», «Аснова») разьмеркавані па спажывецкія патрэбы значную колькасьць лёнавалакна, але ні сельсавет, ні парт ячэйка ня далі рашучага адпору праявам кулацкай уладнічаўкі.

З гэтых фактаў відаць, што ў большасьці сельсаветаў Дубровеншчыны панае поўны самацёк у справе лёназагатовак. Райза і Райкалгасаюз ня праявілі апэрацыйнага штодзённага кіраўніцтва. Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны рашуча пакаяцца ка нец гэтай расхлябанасьці. Трэба на практыцы выкарыстаць вопыт перадавых сельсаветаў, якія паказалі прыклады барацьбы за лён.

Чарнаўсні.

Жывелазагатоўкі

Выканаць плян I кварталу

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

па дакладах Бешанковіцкага і Сеньненскага раённых выканаўчых камітэтаў аб ходзе мясазагатовак у раёне

Выслухаўшы даклады старшыні Бешанковіцкага РВК тав. ШАХА і Старшыні Сеньненскага РВК т. СЕБЕСЕВІЧА аб ходзе мясазагатовак у гэтых раёнах, Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Адзначыць недапушчальна слабы ход мясазагатовак, асабліва сьвіней, і што Бешанковіцкі і Сеньненскі РВК зусім ня ўжылі захадаў да сваячасовай адгрузкі мяса для пралетарскага цэнтру СССР — Ленінграду, наводле дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, што гаворыць аб простай недапасцэнцы гэтымі РВК важнейшых дырэктыў партыі і ўраду.

2. Прапанаваць Бешанковіцкаму і Сеньненскаму РВК, пад асабістую адказнасьць старшынь гэтых РВК, выканаць плян мясазагатовак ва ўстаноўлены СНК тэрмін і ў першую чаргу выканаць не пазьней 15 сакавіка г. г. плян адгрузкі мяса Ленінграду і тэлеграфна паведаміць аб гэтым СНК 15 сакавіка.

Папярэдзіць старшынь памянёных РВК, што за зрыў выкананьня пляну адгрузкі мяса Ленінграду, яны будуць прыцягнуты да строгай адказнасьці.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканомсавету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

4 сакавіка 1932 г
г. Менск
№ 105.

24,5 проц. выкананьня пляну—гане'на лічба

Жывёлагазагатоўкі па БССР праходзяць недапушчальна марудным тэмпамі. На 25 лютага плян жывёла газагатовак I кварталу выкананы толькі на 24,5 проц. Калгасы плян жывёлазагатовак выканалі на 29,2 проц., калгасьнікі і адпрацоўшчыкі—на 23,5. Асабліва адстаюць таварныя фэрмы, якія выканалі свой плян усяго на 4,8 проц.

Гаменна ідзе загатоўка жывёлы па Магілеўскім раёне, які выканаў свой квартальны плян толькі на 7,8 проц., Дубровенскім—9,3 проц., Бешанковіцкім—9,9 і інш.

Загатоўчымі арганізацыямі ігнаруюцца дырэктывы партыі і ўраду аб правядзеньні ў 1932 годзе загатоўкі жывёлы ў асноўным за лік сьвіней. У той час, калі па загатоўках буйнай жывёлы плян I кварталу выкананы на 25 лютага на 37,1 проц., дык на загатоўцы сьвіней плян выкананы толькі на 8,5 проц. Гэтая лічба гаворыць, што на мясцох не вядзецца барацьба за падвы шэньне загатовак сьвіней

Значна адбіваецца на выкананьні пляну жывёлагазагатовак таемны убой жывёлы. Так, толькі ў адным Кізаўскім сельсавеце, Веткаўскага раёну, за адну ноч драпежніцкі зьні шчана 18 галоў буйнай рагатай жывёлы.

Усе матар'ялы з месц сьведчаць аб тым, што некаторыя раённыя арганізацыі недаацэньваюць значэньня жывёлагазагатовак, як адказнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі.

Так, у Капыльскім раёне плян жывёлагазагатовак выкананы толькі на 13,6 проц. У Лешчанскім, Крывашэйнаўскім, Браткаўскім с-с., Капыльскага раёну, плян жывёлагазагатовак IV кварталу 1931 году яшчэ нават не даведзены да паселішч.

У жывёлагазатоўках—важнейшай палітычна - гаспадарчай кампаніі—павінен быць зроблены карэнны пералом. Прымірэнчым адносінам да масавага ўбою кулакамі жывёлы, павінен быць даны рашучы адпор.

Партыйныя, грамадзкія і загатоўчыя арганізацыі павінны мабілізаваць максымум увагі, калгасных мас вакол справы жывёлагазагатовак.

Поўным спагнаньнем цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак мабілізацыяй увагі грамадзкасьці, рашучай барацьбой са спажывецкімі тэндэнцыямі і разбазарваньнем жывёлы, правядзеньнем шырокай масавай работы—забясьпечым поўнае выкананьне пляну жывёлагазагатовак I кварталу.

Разбазарваньне прэміяльных фондаў

КАПЫЛЬ. Жывёлагазагатоўкі ў раёне ідуць самацёкам. Сельспажыўтаварыства сыстэматычна разбазарваюць прэміяльныя фонды жывёлагазатовак. Так, Капыльскае спажывецкае таварыства разбазарыла прэміяльны фонд—800 пар галёш на працягу 3-х дзён. Гэтыя галёші сельспажыўтаварыства прадавала ўсім грамадзянам.

Значна адбіваецца на тэмпах загатовак жывёлы тое, што сельсаветы ня прымаюць ніякіх захадаў да зьнішчэньня таемнага ўбою жывёлы, які за апошні час набыў шырокі размах.

У Лешчанскім, Крывашэйнаўскім і Братаўскім сельсаветах яшчэ нават і да гэтага эсэу плян IV кварталу 1931 году загатовак жывёлы не даведзены да паселішчаў, і ня даны цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам.

Капыльская шавецкая арцель сыстэматычна практыкуе абмен абутку на сьвіней і кароў для сваіх уласных мэтаў, але з боку РВК ніякіх захадаў да ліквідацыі таварообмену ня прымаецца.

У выніку ўсяго гэтага, у раёне плян загатовак жывёлы I кварталу на 25 лютага выкананы толькі на 17,6 проц.

У жывёлагазатоўках Капыльскага раёну павінен быць зроблены пералом. Пракуратура павінна прыцягнуць да судовай адказнасьці вінаватых ў разбазарваньні прэміяльных фондаў жывёлагазагатовак і зьвярнуць сваю ўвагу на Капыльскую шавецкую арцель, якая сыстэматычна займаецца абменам абутку на жывёлу, чым парушае прынцыпы савецкага гандлю і дапамагае кулакам і заможнікам разбазарваць жывёлу.

У першую чаргу трэба прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі выканаць у найкарацейшы тэрмін даныя ім цьвёрдыя заданьні.

Б. В.

Работу жывёлагазатоўчых арганізацый пад рабочы кантроль

КРЫЧАЎ. Выкананьне пляну жывёлагазатовак I кварталу па Крычаўскім раёне пад яўнай пагрозай зрыву. На 25-га лютага спэцыялізаванымі калгасамі плян выкананы: па колькасьці галоў на 20,4 проц. і па вазе—на 4.6 проц., неспэцыялізаванымі калгасамі адпаведна 3,3 проц. і 2,4 проц. Адпасобны сэктар выканаў плян загатовак сьвіней—на 22 проц., буйнай рагатай жывёлы—на 14,8 проц. і дробнай—на 12.2 проц. (Белта).

Лёзунгі да 8 сакавіка

1. У дзень 8 сакавіка бальшавіцкае палкае прывітаньне працоўным жанчынам усяго сьвету. Няхай жыве міжнародны жаночы дзень! Няхай жыве Камінтэрн! Няхай жыве будучы сусьветны Кастрычнік!

2. Крызіс у капіталістычных краінах асуджае на голад дзесяткі мільёнаў беспрацоўных. У СССР—новыя гіганцкія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, ліквідавана беспрацоўе, няўхільна расьце жыцьцёвы ўзровень працоўных. Пралетары ўсіх краін, скідайце капіталізм, ідзеце на шляху рабочых і работніц СССР!

3. Працоўныя жанчыны! На падрыхтоўку новай вайны супроць СССР адкажам выкананьнем пяцігодкі ў чаты ры гады. Актыўнай работай у Асавіяхіме і РСЧА будзем узмацняць абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.

Палкае прывітаньне рабоча - сялянскай Чырвонай арміі—вернаму вартавому савецкіх межаў!

4. Ударніцы сацыялістычнай будоўлі! З бальшавіцкай упартасьцю будзем змагацца за 6 умоў т. Сталіна, за выкананьне прамфінпляну 1932 году. Дамо краіне больш мэталю, вугалю, машын. Выканаем пастановы XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі. Узмацнім эканамічную незалежнасьць Савецкага Саюзу!

5. Да IX зьезду прафсаюзаў, работніцы, яшчэ шырэй фронт сацспаборніцтва і ўдарнага руху. У барацьбе за ўзьвышэньне прадукцыйнасьці працы, за зьніжэньне сабекошту, за якасьць прадукцыі, за працоўную дысцыпліну, работніца, будзь уперадзе!

6. «Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё» (Сталін). Авладаем навукай і тэхнікай! Пашлем лепшых работніц, калгасьніц і іх дзяцей у ВНУ, ВТНУ, тэхнікумы, рабфакі, ФЗВ. Створым сваю пралетарскую інтэлігенцыю!

7. Калдагавор—зброя барацьбы за прамфінплян, за далейшае палепшань не матар'яльна-бытавога становішча рабочае клясы. Работніцы, змагайцеся за выкананьне пістарычных умоў тав. Сталіна.

8. Калгасьніцы, арганізацыяй моцных вытворчых брыгад, ліквідацыяй абязьлічкі, сваячасовай ссыпкай насеньня, аўладаньнем агратэхнікай, узмоцнім калгасную вытворчасьць, забясьпечым перамогу трэцяй бальшавіцкай сяўбы. Завяршым у асноўным суцэльную калектывізацыю ў краіне і ліквідацыю кулацтва як клясы ў 1932-1933 годзе.

9. Работніцы саўгасаў, МТС, калгасьніцы бавоўняных палёў! Правядзеньнем раньняй сяўбы, сваячасовым сканчэньнем будаўніцтва ірыгацыйнай сеткі, высокаякаснай ачысткай насеньня з посьпехам завяршым весьнавыя палявыя работы.

10. Павысім ролю дэлегацкіх сходаў у горадзе і ў вёсцы. Навучым дэлегатку спалучаць марксыцка-ленінскую тэорыю са штодзённай барацьбой за справу будаўніцтва сацыялізму. Увядзеньнем лепшых дэлегатак, перадавых работніц—ударніц у рады камуністычнай партыі.

11. У краіне, якая ўступіла ў пэрыяд сацыялізму, не павінна быць няпісьменных.

Ператворым СССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці!

Работніцы і калгасьніцы, на барацьбу за павышэньне пісьменнасьці і культурнасьці!

12. Арганізуем новую сетку дзіцячых ясьляў, пляцовак, садоў, стаповак, пральняў, па баявому возьмемся за перабудову работы кампэрацыі, актыўным удзелам у грамадзкім кантролі павысіць якасьць работы культурна-бытавых устаноў.

13. «Будучы школай камунізму наогул, прафсаюзы павінны быць, у прыватнасьці, школай кіраўніцтва сацыялістычнай прамысловасьці (а потым паступова—земляробства) для ўсіх рабочых, а потым і для ўсіх працоўных» (Ленін).

Да IX зьезду прафсаюзаў—ні адной работніцы па-за прафсаюзам!

14. У дзень 8 сакавіка палкае прывітаньне камсамолу!

Няхай жыве КІМ—баявы штаб рэвалюцыйнай моладзі ўсяго сьвету!

Дзяўчыны—работніцы і калгасьніцы, ваша месца ў радах ленінскага камсамолу!

15. Павысім клясавую пільнасьць, вы шэй сьцяг непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі. Супроць правага апортунізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» зьлёваў, супроць контрэвалюцыйнага трацкізму, супроць дэзарганізатараў сацыялістычнага наступленьня. Няхай жыве УсеКП(б)!

16. Працоўныя жанчыны! Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі—да новых перамог! Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б)—правадыр сусьветнага пралетарыяту т. Сталін!

УСЕСАЮЗНЫ ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ ПРАФСАЮЗАЎ.

Аб рабоце заводаў сельска-гаспадарчых машын ходзе рамонту с.г. машын у сувязі з пасеўнай кампаніяй

Пастанова Прэзыдыуму ЦКК і Калегіі НК РСІ БССР ад 23-II 32 году

Заслухаўшы даклад тав. Іцэлева, Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК РСІ канстатуюць:

1. Заводамі сельска-гаспадарчых машын («Чырвоны мэталіст», «Гомсельмаш») сваячасова былі ўлічаны магчымасьці ў сэнсе выпрацоўкі машын, патрэбных для вясеньняй кампаніі і за праектаваныя тэрміны забясьпечваюць іх скарыстаньне ў набліжаючую кампанію.

2. Перабоі, якія ёсьць у нармальнай рабоце прадпрыемстваў (Гомсельмаш з-за лістовога жалеза), не адаб'юцца на выкананьні вытворчых заданьняў па забясьпечаньні пасеўнай кампаніі машынамі, дзякуючы прынятым заводакіраўніцтвам мерам па бесьперабойнай рабоце ў выпрацоўцы пасеўных машын.

3. «Чырвоны мэталіст», перажываючы ў апошні час перабоі па прычыне ненармальнай падачы электраэнэргіі (лістапад—88 гадз. прастою, сьнежань—192, студзень—148 гадзін)—ня прыняў захадаў да больш рацыянальнага скарыстаньня энэргіі ў гадзіны, калі яна падаецца, што можна было дасягнуць шляхам устаноўкі кляпальнай машыны для павялічэньня колькасьці выпрацоўкі зубоў для барон «зіг-заг», якая зьяўляецца самым вузкім месцам.

4. Прэзыдыум ЦКК лічыць, што кампанія па рамонце трактароў, якая згодна пастановы Наркамзему павінна быць скончана да 1-га сакавіка, сарвана (на 20-II-32 г. з 1746 трактароў адпраўных адрамантавана ўсяго 704, альбо 40 проц., у тым ліку сыстэмай Трактарацэнтру з 1174 адрамантаванага 401 альбо 35 проц.).

У выніку: 1) Несваячасовай падрыхтоўкі Трактарацэнтрам усіх прадуглед жаных майстэрань для рамонту трактароў (Гарадоцкая, Клімавіцкая, Аршанская).

2) Невыкананьне Трактарацэнтрам на працягу 3 месяцаў пастановы Наркамзему аб дасылцы трактароў для рамонту заводам («Камінтэрн»—92, «Чырвоны адраджэнец»—72, «Рухавік рэвалюцыі»—31).

5. Белмэт і саюз мэталістых у частцы ўзятых на сябе абавязкаў па забясьпечаньні рамонтных майстэрань Трактарацэнтру адпаведнай кваліфікаванай рабсілай—засталіся да гэтага часу ня выкананымі, а таксама з боку Трактарацэнтру ня былі дастаткова прыняты меры па вярбоўцы гэтай рабочай сілы, што ў сваю чаргу адбілася на ходзе рамонту.

6. Да гэтага часу няма ў справе выкананьня рамонту часткі саўгасных трактароў (103 трактара), якія на падставе разьмеркаваньня Наркамзему павінны рамантавацца ў сыстэме Трактарацэнтру, між тым апошні лічыў для сябе гэта неабавязковым і не прыступае да выкананьня рамонту азначаных трактароў.

7. У пагражаючым становішчы знаходзіцца забясьпечаньне рамонту трактароў запаснымі часткамі (здавальненьне на 59 проц.) і такое-ж становішча па аўтаматах для трактарных плугоў.

8. Сельгаснаб сваячасова не забясьпечыў завод «Чырвоны адраджэнец» запаснымі часткамі да трактароў і наступаючыя зараз трактары ня могуць быць адрамантаваны з-за адсутнасьці зап. частак.

Выходзячы з пакаязанага прэзыдыум ЦКК і калегіі НК РСІ Бел. пастанаўляюць:

1. Наркамзему пад асабістую адказнасьць тав. Кіпенварліна ў 3-хдзённы тэрмін даць указаньне раёнам аб наладжанай пасылцы трактароў для рамонту прымацаваным заводам.

2. Наркамзему ў 2-хдзённы тэрмін вырашыць пытаньне адносна рамонту саўгасных трактароў (103 трактары), якія лічацца за Трактарацэнтрам і забясьпечыць сваячасовае выкананьне з тым, каб рамонт быў выкананы ў тэрмін.

3. Наркамзему—тав. Кіпенварліну і Мэталяаб'яднаньню—тав. Левіну ў 2-хдзённы тэрмін устанавіць праграму рамонту трактароў для заводаў Белмэту з тым, каб заводы ведалі разьмер работ.

4. Сельгаснабу і Белмэталяаб'яднаньню пад асабістую адказнасьць тт. Таланілы і Левіна ў 2-хдзённы тэрмін заключыць дагаворы на выраб заводамі Белмэту аўтаматаў для трактарных плугоў.

5. Заводу «Чырвоны мэталіст» пад адказнасьць дырэктара заводу т. Фрумкіна, улічваючы, што стальное ліцьцё ёсьць на 65 плугоў—прыняць захады да фарсіраваньня выпрацоўкі плугоў.

6. Заводакіраўніцтву «Чырвоны мэталіст» пад адказнасьць тав. Фрумкіна падрыхтаваць і пусьціць у эксплёатацыю 2-ю кляпальную машыну, маючы на ўвазе, што вузкім месцам для вытворчасьці барон «зіг-заг» зьяўляецца выпрацоўка зубоў (для якіх ёсьць усяго 1 машына).

7. Белмэту і ЦП саюзу машынабудаўніцтва, пад асабістую адказнасьць тав. Левіна і Асіноўскага ў 3-хдзённы тэрмін выканаць разнарадкі на забесьпячэньні патрэбнай кваліфікаванай рабсілай рамонтных майстэрань. Трактарацэнтру ў 2-хдзённы тэрмін накіраваць 12 кавалёў у гэтыя майстэрні.

8. Лічыць неабходным цэнтральным і мясцовым газэтам узяць пад неаслабны кантроль ход рамонту трактароў, асьвятляючы штодзённа выкананьне рамонту ў адпаведнасьці з дадзенымі заданьнямі Наркамзему і Трактарацэнтру.

9. Даручыць РКК-РСІ, якія знаходзяцца ў мясцох разьмяшчэньня трактарных рамонтных майстэрань і заводаў, сыстэматычна правяраць выкананьне рамонту трактароў, на падставе графіка рамонту, які забясьпечвае выкананьне да ўстаноўленага тэрміну і кожную пяцідзённу паведамляць ЦКК НК РСІ.

Разам з гэтым ЦКК НК РСІ папярэджвае, што пасканы выпуск трактароў ні ў якім разе ня можа ісьці за лік пагаршэньня якасьці рамонту і ў выпадку парушэньня гэтага—прыцягваць да адказнасьці.

Старшыня ЦКК КП(б)Б
Нарком РСІ Бел. КАЛИН.

Авалодываюць тэхнікай

За рэалізацыю лёзунгу тав. Сталіна—«авладаць тэхнікай» змагаюцца мільённыя масы рабочых і працоўных Савецкага саюзу. Рацыяналізатарская думка працуе на перадавых прадпрыемствах, саўгасах і калгасах за хутчэйшую тэхнічна-эканамічную незалежнасьць СССР.

На здымку: брыгада электрамацэрэраў машынабудаўнічага заводу імя Варашылава за зборкай варштату пэлектразварцы мядзяных труб.

САВЕТЫ і работа на транспарце

Вялізарны рост сацыялістычнага будаўніцтва па ўсіх галінах прамысловасьці, рэканструкцыя сельскай гаспадаркі на базе саўгасаў і калгасаў патрабуюць карэннага палепшаньня работы чыгуначнага транспарту, які зьяўляецца непарыўнай часткай ўсяго арганізму сацыялістычнай індустрыі.

Чыгуначны транспарт за апошнія гады мае значныя посьпехі. Акрамя павялічэньня грузавароту, павялічылі пасажырскія перавозкі, вырасла ульная цягавая сіла паравозаў і гру запад'ёмнасьць вагоннага парку. Выкасла таксама працягласьць чыгуначнай сеткі і г. д. Усе гэтыя вялізарныя посьпехі дасягнуты пад кіраўніцтвам партыі і на аснове магутнага разгортваньня сацспаборніцтва чыгуначнікаў.

Ня гледзячы на посьпехі ў разьвіцьці транспарту ён яшчэ адстае ад хуткіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Чыгуначны транспарт усё яшчэ зьяўляецца вузкім месцам у народнай гаспадарцы. Ён яшчэ далёка не спраўляецца са сваімі задачамі. Аб гэтым з усёй сур'ёзнасьцю падкрэсьліў Чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б)Б.

Якое вялікае значэньне чыгуначны транспарт мае для сацыялістычнай народнай гаспадаркі сьцьвярджае тое, што партыя ня раз займалася гэтым пытаньнем. У пастановах ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, і СНК БССР намечана разгорнутая праграма дзейнасьці транспарту, якая ўскладае адказныя задачы і на саветы ў горадзе і вёсцы.

Увага і намаганьні пралетарскай грамадзкасьці павінны быць зараз накіраваны на бальшавіцкае правядзеньне сыстэмы канкрэтных мерапрыемстваў па палепшаньні работы транспарту. У рабоце транспарту нам зараз патрэбны бальшавіцкі тэмпы і высокая якасьць.

Прыходзіцца, аднак, канстатаваць, што значная частка гарсаветаў і сельсаветаў, іх сэкцый і дэпутацкіх групы не падышлі яшчэ шчыльна да вырашэньня канкрэтных задач сацыялістычнай рэканструкцыі транспарту і рашучай барацьбы з яго адставаньнем.

Прычыны адставаньня транспарту паказаны ў партыйных дырэктывах па складзе тав. Андрэева. У задачу саветаў уваходзіць разгортваньне барацьбы за ліквідацыю гэтых прычын адставаньня праз мабілізацыю шырокіх працоўных мас, дэпутатаў саветаў і савецкага актыву, за канкрэтнае ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна і выкананьне загаду тав. Андрэева.

Аб тым, што некаторыя саветы не падышлі да канкрэтнага вырашэньня задач палепшаньня транспарту сьведчаць наступныя факты:

Калі транспартныя сэкцыі гарсаветаў арганізаваны, дык ня ўсюды забясьпечана кіраўніцтва імі. Транспартная сэкцыя Менгарсавету са жніўня ні разу ня зьбіралася. Дэпутаты гарсавету на Менскім вузле не адчуваюцца. Яны не ўзначальваюць барацьбу за рэканструкцыю транспарту.

Менскі Гарсавет па-бальшавіцку ня кіруе сэкцыяй і дэпутацкімі групамі на вузле. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі вузла ігнаруюць дэпутацкую групу, недаацэньваюць яе ролі як масавай арганізацыі савету і не дапамагаюць разгортваць яе работу.

Ня так даўно Аршанскі гарсавет на сваім пленуме вынес пастанову—«лічыць неабходным арганізаваць транспартную сэкцыю». Чаму толькі «лічыць неабходным»? Аршанскі вузел таксама адзін з важнейшых у БССР. Нам вядомы добрыя прыклады змаганьня чыгуначнікаў Аршанскага вузла за здаровы транспарт, за ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна. Аднак, гарадзкі савет не вялхоплівае гэтай гатоўнасьці чыгуначнікаў змагацца за рэканструкцыю транспарту. Гарсавет спасылаецца на «аб'ектыўныя» прычыны,—на адлегласьць вузла ад гарсавету. Крычаўскі РВК на працягу году ні разу ня быў на вузле і яго становішчам ня цікавіўся.

На ст. Жлобін не забясьпечваецца харчаваньне цягніковай брыгады. Незадавальняюча пастаўлена работа ТСТ. Дэпутацкія групы страцілі з поля гледжаньня работу транспартнага спажывецкага т-ва. Жлобінскі гарсавет ня кіруе дэпутацкімі групамі. 16 сьнежня на ст. Асіпавічы павялічыўся грузапаток. На ст. здарылася пробка. Дэпутацкая група не дапамагла. Гарсавет не перабудаваў сваю работу, не перанёс цэнтр цяжару дзейнасьці ў цэх, групу, брыгаду

Рад сельсаветаў не арганізавалі работы для барацьбы са сьнегавымі заўвеямі. Ня ўсё зроблена для замацаваньня за вёскамі сталых вучасткаў чыгункі, не арганізавана рабочая сіла і гуж.

Усе гэтыя адмоўныя прыклады гавораць аб тым, што традыцыі «адасобленасьці» чыгуначнага транспарту перашкаджаюць пасьпяховаму і рашучаму ажыцьцяўленьню 6 умоў тав. Сталіна і хутчэйшай ліквідацыі адставаньня, бюракратызму і замкнутасьці ў рабоце транспартных арганізацый.

Тав. Андрэеў на сходзе актыву чыгуначнікаў Маскоўскай арганізацыі УсеКП(б) у сваёй прамове сказаў: «кітайскую сьцяну «адасобленасьці» паміж чыгуначнікамі і ўсімі іншымі пластамі рабочых, паміж чыгуначнай гаспадаркай і астатняй гаспадаркай на заўсёды патрэбна зламаць».

Гэта яшчэ раз падьцьвярджае, што цэнтралізацыя зпарату кіраўніцтва транспарту не павінны быць перашкодай для ўдзелу мясцовых партыйных і прафэсыянальных арганізацый і саветаў у справе ўзмацненьня і рэканструкцыі транспарту. Саветы павінны аддаць больш увагі транспарту. Канкрэтней кіраваць сэкцыямі і дэпутацкімі групамі.

На выклік ленінскіх машыністаў арганізаваць усесаюзную перакліч-спаборніцтва транспартных сэкцый і дэпутацкіх груп ужо адказалі рад сэкцый і дэпутацкіх груп БССР. У першую чаргу, на гэты выклік адказала канкрэтнымі абавязкамі нарада ўсіх гарсаветаў, якая адбылася пры ЦВК БССР 3 сьнежня. За гэтаю нарадаю ўступіла ў спаборніцтва транспартная сэкцыя Віцебскага гарсавету і дэпутацкая група Віцебскага чыгуначнага вузла, Гомельскі гарсавет, дэпутацкая група Гомельскага чыгуначнага вузла. За кароткі час гэтыя сэкцыі і дэпутацкія групы паступова выконваюць узятыя на сябе абавязкі. Значна павялічваецца актыў вакол дэпутацкіх груп, групы разьмеркаваны па брыгадах—цэх, паравоз і г. д. Дэпутацкая група заводу імя Ланцуцнага ўстанавіла пасты з дэпутатаў і актыву ў тых цэхох і вучастках, якія затрымліваюць ход выкананьня работ. Яна зьвярнулася да дэпутацкіх груп заводу імя Сталіна (гор. Сталіна). Мос снабзбыт, Стальзбыт аб сваячасовай адгрузцы сыравіны і выкананьня заказаў.

Там, дзе праяўлена належнае кіраўніцтва з боку гарсаветаў, сэкцый і дэпутацкія групы шырока разгортваюць работу за здаровы транспарт.

Ад дэпутатаў гарсавету мы вымагаем вышэйшых паказьнікаў работы ўдарніцтва. Дэпутаты ня адольных змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, трэба вывесьці са складу сэкцый. Органы пралетарскай дыктатуры не павінны быць засьмечаны балястам непрацаздольных дэпутатаў.

Прэзыдыум ЦВК БССР даў канкрэтныя паказьні РВК і саветам аб іх канкрэтным удзеле ў рабоце транспарту. Выходзячы з гэтай пастановы, саветы, на тэрыторыі якіх знаходзяцца чыгуначныя вузлы, павінны ўзмацніць работу транспартных сэкцый ў прыватнасьці ўзмацніць бюро сэкцый працаздольнымі работнікамі за лік ударнікаў. Дэпутацкія групы адпаведна з гэтымі дырэктывамі вызначаюць абязьлікі кожнага дэпутата на кожным вучастку яго работы.

Зразумела, што ўсё тое, што зараз праводзяць саветы, сэкцыі дэпутацкія групы на транспарце, далёка яшчэ недастаткова для транспарту. Мала прыняць выклік, мала запісаць пастанову. Канкрэтная работа і дасягненьні будуць заключацца ў тым, калі прынятыя абавязкі будуць на справе ажыцьцяўляцца на аснове шырокага разгорт ваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Што зьяўляецца асноўнымі зьвеньнямі работы дэпутацкіх груп на транспарце? Галоўныя зьвеньні: узмацненьне працоўнай дысцыпліны, добраякасны рамонт паравозаў і вагонаў, замацаваньне спаранай язды, ліквідацыя абязьлічкі і ўраўнілаўкі ў зарплаце, укараненьне гаспадарчага разьліку, эканомнае выдаткаваньне матар'ялаў, палива, арганізацыя сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Задачы зусім ясныя. Іх трэба толькі ажыцьцяўляць.

Пытаньні матар'яльна-бытавога абслугоўваньня чыгуначнікаў таксама павінны займаць не малаважнае месца ў рабоце сэкцый дэпутацкіх груп. Прыкладна, на ст. Жлобін нездавальняюча працуе ТСТ. Дэпутацкая група вылучае брыгаду, якая выяўляе недахопы работы, намячае меры іх адхіленьня праз належныя арганізацыі, дабіваецца лепшага разьмеркаваньня тавараў, адкрыцьця дадатковых ларкоў, падбор лепшага пэрсаналу работнікаў прылаўка.

Нельга толькі абмяжоўвацца адным фармальным уступленьнем, у сацспаборніцтва. Так дэпутацкая група гарсавету на Віцебскім чыгуначным вузле ўключылася ў перакліч на транспарце, а канкрэтных дасягненьняў ў гэтай рабоце яна ня мае. Сам Віцебскі гарсавет працуе лепш чымся група. Гарсавет рашуча паварачае тварам да транспарту другія сэкцыі савету—грамадзкае харчаваньне, культурна-асьветную,

Аб арганізацыі працы ў калгасах

Пастанова НКЗ і праўленьня Калгасцэнтру БССР

У выкананьне пастаноў ЦК УсеКП(б) ад 4-II, ЦК КП(б)Б ад 22-II 1932 году «аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў» і пастановы Калгасцэнтру СССР, Калегіі НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру БССР пастаўляюць:

Аб брыгадах

1. Абавязаць райза, калгассаюзы і праўленьні калгасаў правесьці арганізацыю брыгад на ўсіх калгасах не пазьней 1 красавіка 1932 г.

Брыгады павінны арганізоўвацца па вытворчым прынцыпе па сталым складзе калгасьнікаў з тым, каб такія брыгады, як правіла, выконвалі ўсе асноўныя с. г. работы на працягу ўсяго году на пэўных зямельных вучастках.

За кожнай сталай паляводчай брыгадай замацоўваюцца на ўвесь год пэўныя зямельныя вучасткі з пасобным культурамі, альбо прушай культур прычым культуры па вызначаемых вучастках трэба камбінаваць з такім разьлікам, каб максымальна захваціць сталы склад брыгад. На гэтых вучастках брыгада выконвае ўсе работы, пачынаючы з зорыва і канчаючы апрацоўкай і здачай прадукцыі.

Брыгада, выконваючы ўсе працэсы работ на замацаваным за ёю вучастку, нясе поўную адказнасьць за выкананьне заданьняў па выхадзе прадукцыі як па колькасьці, так і па якасьці. Не дапускаць вызначэньня брыгадам вучасткаў зямлі для іх апрацоўкі ў вялікай колькасьці палёў севазвароту.

2. У дробных калгасах арганізуецца адна паляводчая брыгада, а ў сярэдніх і больш буйных арганізуецца 2-3 і больш брыгад.

У садавагародных калгасах апроч паляводчых брыгад, арганізуюцца асобныя брыгады па гарадніцтве і садоўніцтве.

Стварэньне сталых брыгад не павін на, аднак, выключаць магчымасьці арганізацыі брыгад не на ўвесь с. г. сэзон. А на пасобныя перыяды (пасеў, дагляд за пасевамі, уборка) у тых калгасах, дзе гэта выклікаецца масцовымі ўмовамі (размер калгасаў, арганізаванасьць).

3. Для абслугоўваньня жывёлагадоўчых таварных фэрм (МТФ, СТКФ і трусаводных фэрм), а таксама для абслугоўваньня птушкаводных і пчалярных фэрм у кожным калгасе арганізуюцца сталыя брыгады на кожнай фэрме ў пасобку, у тых калгасах, дзе акрамя таварнай фэрмы, як такой, ёсьць абгароджаная жывёла розных відаў у невялікай колькасьці, арганізуецца асобная брыгада для абслугоўваньня ўсіх відаў жывёлы па-за фэрмай.

4. Колькасны склад сталых калгасных брыгад у паляводстве і гарадніцтве ўстанаўляецца ў кожным калгасе ў пасобку, выходзячы з размеру калгасу, вытворчых заданьняў калгасу, норм, выпрацоўкі і тэрмінаў выкананьня работ па пэрыядах.

Склад брыгад нагрузка кожнай брыгады і арганізацыя работ унутры брыгад павінны быць зроблены так, каб усе работы, зьвязаныя з асноваой сяўбой, былі праведзены па ўстаноўленых ніжэй тэрмінах:

Назва груп культур	Працягласьць сяўбы ў дн.	Скончэньне па зонах		
		Паўдн.	Центр.	Паўночн.
1. Раньніх яравых зярнёвых, лубіну на насеньне і сяжа-сьнелых бабовых і славечніку	10	8-V	12-V	18-V
2. Тэхнічных (лёну, канапель)	10	15-V	20-V	25-V
3. Бульбы і кораньплодаў	15	15-V	20-V	20-V
4. Гародніх:				
а) капусты	10	20-V	25-V	30-V
б) сталовых кораньплодаў	10	5-V	10-V	15-V
в) памідоры	10	20-V	20-V	25-V
г) гуркі	10	15-V	20-V	25-V
д) цыбуля	10	5-V	15-V	20-V
5. Іншых яравых	15	20-V	25-V	30-V
6. Наогул сяўбу ўсіх яравых скончыць не пазьней	—	20-V	25-V	30-V
7. Азімых культур	15	15-IX	10-IX	6-IX

Увага: Лёну раньняй сяўбы засеяць ня менш 75 проц. агульнай пасяўнай плошчы.

5. Пры пабудове вытворчых брыгад трэба кіравацца наступнымі асноўнымі прынцыпамі: устанаўляецца патрэбнасьць рабочых і цягавай сілы для выкананьня ўсяго вытворчага заданьня калгасу на ўвесь год па пэрыядах, выходзячы з устаноўленых тэрмінаў выкананьня работ.

Устанаўляецца па ніва галінах гаспадаркі і вытворчых вучастках арганізуюцца сталыя брыгады. Арганізуюцца брыгады для абслугоўваньня жывёлагадоўлі, выходзячы з норм выпрацоўкі і нагрузкі жывёлы на кожна га калгасьніка.

У паляводзтве брыгады арганізуюцца па вытворчых вучастках з севаўчы культурамі, з дапушчэньнем другіх культур для роўнамернай нагрузкі брыгад на ўсе пэрыяды, напрыклад, у лёнамалочным калгасе пры сумежных вучастках пасеву лёну, брыгада арганізуецца на вучастках з пасевамі тэхкультур і траў; зярнёвых і прапашных культур. У бульбана-жывёлагадоўчых калгасах—брыгады арганізуюцца па вучастках з прапашнымі і зярнёвымі культурамі.

Пры вызначэньні вучасткаў брыгадам, улічваць размяшчэньне на іх асобных культур больш буйнымі масівамі.

Пры арганізацыі ў дробных калгасах адной брыгады па паляводзтве асобныя групы гэтай брыгады прымаюцца і нясуць адказнасьць за выхад прадукцыі асобных культур.

6. Пры пабудове брыгад праўленьні калгасаў павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на правільную расстаноўку сіл у брыгадзе, падбор у брыгадзе неабходнай колькасьці людзей, па іх кваліфікацыі, падбор цягавай сілы, інвэнтара, збруі, транспарту, устанаўленьне вытворчых заданьняў брыгадам, праверку і кантроль іх выкананьня і па станоўку належнага ўліку працы.

У вытворчым заданьні брыгадам абавязкова паказаць.

а) аб'ём работы, тэрмін пачатку і аканчэньня кожнага віду работ, падлягаючых выкананьню (ворыва, сяўба, праполка і г. д.).

б) нормы выпрацоўкі па кожным з гэтых работ і іх зьдзельную ацэнку у працадніх, а таксама колькасьць працадзён, якая вызначаецца брыгадзе за выкананьне ў цэлым усяго вытворчага заданьня.

в) агравытворчыя мерапрыемствы па кожным ніва работ і па кожнай культуры (тэрміны сяўбы, прыроот уражаю, нормы высеву, тэрміны уборкі і інш.), заданьні па якасьці работы, разьмер выхаду прадукцыі ў цэнтнерах, ліпрах, штуках і інш.

г) сьпіс замацаваных за брыгадай калгасьнікаў, жывёлы і інвэнтара.

7. У мэтах ліквідацыі абязьлічкі ў карыстаньні с. г. інвэнтаром і цягавай сілай, да 1 красавіка павінны быць зладзены брыгадзірам праўленьнямі калгасаў па асобным сьпісу ўсе машыны, інвэнтар, транспарт, збруя і ня гавая сіла, якія замацоўваюцца за брыгадай. Сьпіс складаецца ў двух пасобніках, з якіх адзін знаходзіцца ў праўленьні калгасу, а другі—у брыгадзіра.

В Унутры кожнай брыгады расстаноўку калгасьнікаў па групах, дачу вытворчых заданьняў асобным групам і замацаваньне за пасобнымі калгасьнікамі машын, інвэнтара, жывёлы і збруі ўтварае брыгадзір. Калгасьнікі нясуць непасрэдную адказнасьць за станоўчае рабочае жывёлы і інвэнтара, які ім перадаецца пад расьпіску. Дробны бягучы рамонт ляжыць на абавязку гэтых калгасьнікаў, за якімі за мацаваны інвэнтар, машыны і збруі.

9. Для падвозкі і падрыхтоўкі кармоў і дагляду за рабочай жывёлай у часе адпачынку на кожныя 20-25 коняй вылучаецца конюх фуражыр, які нясе адказнасьць за правільнае ўтрыманьне і кармленьне коняй, а за стан коняй нясуць адказнасьць тыя калгасьнікі, якія на іх працуюць.

10. На таварных малочных фэрмах работа памж калгасьнікамі і калгасьніцамі брыгады размяркоўваецца такім чынам, каб дойка і кармленьне малочных кароў праводзілася адной і той-жа асобай.

Для падвозкі кармоў, вады, падсьцілкі, вывазкі гною і нагляду за жывёлай у начны час—ся складу жывёлагадоўчай брыгады вылучаюцца асобныя калгасьнікі.

11. У калгасах хутарскіх раёнаў—пры арганізацыі брыгад улічваць мамаючыяся асаблівасьць у гэтых раёнах (размяшчэньне пасеваў асобных культур на вялікай колькасьці асобных вучасткаў раскіданасьць паселішчаў пры хутарской сыстэме).

Падбор складу брыгад у гэтых калгасах рабіць такім парадкам, каб калгасьнікі асобных груп хутароў, размешчаных паміж сабой на блізкай адлегласьці, уключаліся ў асобныя брыгады. Замацоўваць за гэтымі брыгадамі вытворчыя вучасткі, зямельныя плошчы якіх знаходзяцца на блізкай адлегласьці ад гэтых хутароў.

Фармаваньне брыгад для абслугоўваньня жывёлагадоўлі рабіць з тых паселішчаў, якія знаходзяцца вакол месца знаходжаньня таварных фэрм.

НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру БССР папярэджваюць усе Райза і праўленьні калгассаюзаў хутарскіх раёнаў, што асаблівасьці гэтых раёнаў ні ў якім выпадку ня могуць перашкаджаць арганізацыі брыгад па вытворчым прынцыпе.

12. Пры арганізацыі брыгад і размеркаваньні рабочай сілы па брыгадах улічыць неабходнасьць поўнага скарыстаньня жаночай рабочай сілы і падлеткаў, вызваленьне лішкаў рабочай сілы і скарыстаньне іх на адыходных работах.

Аб брыгадзірах

1. Апэрацыйнае кіраўніцтва брыгады ажыцьцяўляецца непасрэдна брыгадзірам, таму праўленьні калгасаў абавязаны разам з арганізацыяй брыгад вызначыць брыгадзіраў, са складу лепшых калгасьнікаў і калгасьніц у першую чаргу ўдарнікаў, найбольш аўтарытэтных і добра ведаючых вытворчасьць і здольных арганізаваць калгасьнікаў на выкананьне вытворчага заданьня.

2. НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру абавязваюць праўленьні ўсіх калгасаў не пазьней 1 красавіка г. г.:

а) азнаёміць брыгадзіраў з іх вытворчымі заданьнямі для кожнай брыгады пасобку;

б) перадаць брыгадзірам вытворчыя пляны—нарады, устаноўленыя нормы выпрацоўкі, ацэнку работы ў працадніх, сьпісы і працоўныя кніжкі для калгасьнікаў брыгады;

в) азнаёміць брыгадзіраў с зямельнымі вучасткамі, якія адводзяцца брыгадам для апрацоўкі;

г) перадаць брыгадзірам па опісах рабочых коняй, машыны, збруя і інвэнтар.

3. Пасьля арганізацыі брыгад кожны брыгадзір павінен не пазьней 5 красавіка г. г.:

а) прапрацаваць на вытворчых нарадах з калгасьнікамі свае брыгады атрымаўшае вытворчае заданьне;

б) размеркаваць увесь склад брыгады на групы і даць кожнай групе калгасьнікаў вытворчае заданьне на пэрыяд веснавой сяўбы;

в) размеркаваць абавязкі, рабочую жывёлу і інвэнтар памж калгасьнікамі брыгады.

4. Адказнасьць за ўсю работу брыгады як па якасных, так і колькасных паказьніках нясе асабіста брыгадзір, у сваю чаргу брыгадзір патрабуе поўнай адказнасьці ад кожнага калгасьніка за даручаную яму работу.

5. Праверку выкананьня заданьняў, улік працы налічэньне і запіс працадзён у працоўныя кніжкі па колькасьці і якасьці працы ўтварае брыгадзір.

6. Брыгадзір павінен штодзённа інфармаваць праўленьне калгасу шляхам перадачы штодзённых данясеньняў аб ходзе выкананьня заданьняў па нарадах.

7. Надаючы вялікую ролю і значэнь не брыгадзіраў у калгаснай вытворчасьці, каб не дапускаць цякучасьці складу брыгадзіраў, назначэньне і зьмены брыгадзіраў праводзіць выключна па пастанове праўленьня калгасу.

8. Абавязаць праўленьні калгассаюзаў не пазьней 5 красавіка правесьці раённыя зьлёты брыгадзіраў па спэцыялізаваных галінах гаспадаркі (жывёлагадоўля, тэхкультура і інш.). Забясьпечыць дасканалы вучот брыгадзіраў, сыстэматычную работу па ўзьнаўленьні іх кваліфікацыі.

Асаблівую ўвагу зьвярнуць на выстаўленьне ў якасьці брыгадзіраў жанчын-калгасьніц у першую чаргу ў галіне жывёлагадоўлі.

Аб зьдзельшчыне

1. «Ажыцьцяўленьне на справе рашэньняў VI зьезду саветаў аб укараненьні зьдзельшчыны, палепшаньні вучоту і аб ацэнцы працы кожнага калгасьніка ў працадніх у залежнасьці ад колькасьці і якасьці зробленай ім работы, працявае заставацца важнейшай задачай» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4-2-32 г.).

У адпаведнасьці з гэтым НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру БССР прапануюць усім райза і праўленьням калгассаюзаў і калгасаў ажыцьцявіць у гэтым годзе перавод на зьдзельшчыну ўсіх работ у калгасах з тым, каб палепшыць якасьць работы, павысіць прадукцыйнасьць работы і таварнай калгаснай гаспадаркі.

2. НКЗ і Калгасцэнтр БССР прапануюць у далейшым пры правядзеньні зьдзельшчыны пакласьці ў аснову наступнае:

а) пры ворыве і баранаваньні вучот працы і ацэнка работ павінны праводзіцца з колькасьці выпрацаваных га, з абавязковым вучотам тэрмінаў выкананьня работы, глыбіні ўзорваньня і баранаваньня без агрэхаў;

б) пры пасеве збожжа і траў ацэнка ў працадніх павінна праводзіцца па гектарна, з вучотам тэрмінаў выкананьня сяўбы, норм высеву насеньня, глыбіні яго заделкі і адсутнасьці прасеву; пры пасеве прапашных і тэхнічных культур пры гэтым яшчэ трэба рабіць вучот выкананьня ўстаноўленай шырыні міжрадзьдзяў і правільнага накіраваньня радкоў;

в) пры пасадцы рассады ацэнка ў працадніх праводзіцца з колькасьці высаджанай і прыняўшайся рассады на 1 га пры захаваньні ўстаноўленага размеру міжрадзьдзяў, правільнага размяшчэньня радкоў і выкананьня пасадкі ў вызначаныя тэрміны;

г) пры праполцы ацэнка работ праводзіцца з аднаго га з вучотам тэрмінаў і якасьці прапалачных работ, поўнага зьнішчэньня пустазельля і адсутнасьці пашкоджаньня расьлін;

д) пры ўборцы ўраджаю збожжавых, ацэнка праводзіцца з аднаго га з вучотам тэрмінаў выкананьня работ чыстаты ўборкі і найменшых страт (расструска зярня і г. д.);

е) пры ўборцы корэнь і клубнеплодаў, гародніны, пры абмалоце збожжа і апрацоўцы лёну ацэнка праводзіцца з колькасьці сабранай прадукцыі ў цэнтнэрах з аднаго га;

3. Перад пачаткам уборкі праўленьне калгасу павінна ўстанавіць выхад прадукцыі з аднаго га ў цэнтнэрах (пробны абмалот, пробная выкапка бульбы кантрольных дзялянак і г. д.). Устаноўлены выхад прадукцыі зьяўляецца кантрольным заданьнем для збору прадукцыі і ацэнкі работы.

У жывёлагадоўлі зьдзельшчына і расцэнка работ у працадніх, як правіла павінны ўжывацца з колькасьці атрымліваемай прадукцыі:

а) на малочнай фэрме—ад колькасьці выдаенага малака і колькасьці і сытасьці вырашчаных цялят;

б) у цялячых фэрмах—ад выкаду маладняка, яго сытасьці;

в) у свінагадоўчых фэрмах—ад колькасьці і якасьці выгадаваных парасят і сытасьці сьвіней;

г) на птушкаводных фэрмах — ад колькасьці яек, выгадаваных курэнят і прыросту мяса;

д) на таварных пасеках—ад колькасьці атрыманай прадукцыі (мёду, воску, жывых пчол);

е) на трусаводных фэрмах—ад прыросту вагі і колькасьці вырашчанага маладняка.

5. Формы зьдзельшчыны павінны быць простымі і зразумелымі масе калгасьнікаў, таму НКЗ і Белкалгасцэнтр БССР папярэджваюць райза, праўленьні калгассаюзаў і калгасаў ад прамеранага ўскладненьня форм зьдзельшчыны, увядзеньня прагрэсыўнай зьдзельшчыны, індывідуальных форм зьдзельшчыны, дзе гэта ня выклікаецца ўмовамі вытворчасьці (напрыклад на ворыве, малацьбе).

Аб нормах выпрацоўкі

1. У кожным калгасе павінны быць устаноўлены нормы выпрацоўкі па ўсіх відах работ на 1932 год, у аснову якіх павінны быць пакладзены вопыт работы лепшых перадавых калгасьнікаў і лепшых брыгад, з улікам выкананьня ў карацейшы тэрмін веснавых і іншых палявых работ, пашыраючайся мэханізацыі калгаснай вытворчасьці і дасягнутых калгасамі і брыгадамі навыкаў у арганізацыі калектыўнай працы.

2. Распрацаваныя праўленьнем калгасу нормы выпрацоўкі з удзелам лепшых калгасьнікаў, асабліва ўдарнікаў і ўдзельнічаючых у сацспаборніцтве, абгаворваюцца вытворчымі нарадамі па галінах гаспадаркі і зацьвярджаюцца агульным сходам калгасьнікаў.

3. Пры распрацоўцы норм выпрацоўкі неабходна папярэдзіць мэўныя месцы ў практыцы калгасаў факты ўстанаўленьня яўна зьніжаных норм, якія заціраюць тэрміны работы, затрымліваюць у калгасах лішнюю рабочую сілу, абясцэньваюць працадзень і падрываюць матар'яльнае становішча як калгасаў, так і саміх калгасьнікаў, а таксама і факты яўна перавышаных норм, якія могуць выпрацоўваць толькі асобныя ўдарнікі і ўдарніцы.

4. Абавязаць сэктары арганізацыі працы Калгасцэнтру і НКЗ да пачатку веснавой пасеўнай кампаніі выдаць асобнай брашурай прыкладныя нормы выпрацоўкі для ўсіх відаў сельгасработ.

Аб ацэнцы работы калгасьнікаў у працаднёх

1. Ацэнка работы калгасьнікаў павінна вытвараца выключна ў працаднёх.

НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру катэгарычна забараняюць правядзеньне вучоту і ацэнкі працы калгасьнікаў па колькасьці прапрацаванага часу (у днёх-гадзінах), а не па колькасьці і якасьці выкананай работы і папярэджваюць супроць спробы пераводу аплаты працы калгасьнікаў на грашовую зарплату. НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру прапануюць усім праўленьням калгасаў, разам з дачай вытворчага заданьня, тэрмінамі і якасьцю яго выкананьня, вызначаць брыгадам поўную колькасьць працадзён, звыш якой брыгадзір ня можа залічваць за работу, выкананую ўсёй брыгадай.

2. У залежнасьці ад труднасьці, складанасьці і кваліфікацыі ўстанавіць наступныя пяць груп работ і зьдзельныя іх ацэнкі:

а) лёгкія работы—з ацэнкай нормы выпрацоўкі ў 50 сотак працадня (паганяты коняй, прыкатваньне глебы простым катком, варочаньне лёвасаломы, вартаўнік садоў і г. д.);

б) сярэднія работы—з ацэнкай нормы выпрацоўкі ў 75 сотак працадня (ворыва, дыскаваньне, пасадка бульбы ў баразну, выбарка бульбы, ігрыбаньне сена коннымі граблямі, полка лёну);

в) цяжкія работы (простыя) — з ацэнкай нормы выпрацоўкі ў адзін працадзень (копка гною, касьба траў касою, возка сена, ручное жніво, вязка снапоў, выворваньне бульбы, церабленьне лёну, расьціл лёну, цялятніцы, дагляд за маладняком, скотнікі і канюхі-фуражыры і г. д.);

г) цяжкія работы, патрабуючыя спэцыяльнага вопыту з ацэнкай нормы выпрацоўкі ў адзін працадзень і 25 сотак (касьба касаркай, каруючы лёнацеразілкай, падаваньне трасты ў лёнамялку, тропка лёну на мялцы, пасадка дрэў, скотницы-даяркі, сьвінары, птушніцы і г. д.).

д) кваліфікаваныя работы, з ацэнкай нормы выпрацоўкі ў адзін працадзень і 50 сотак (падача снапоў у барабан трактарысты, машыністы, кавалі, гародніки-садаводы, тэхніка-жывёлаводы, вэтсанітары па спэцыяльнай адукацыі і г. д.).

3. На падставе гэтай прыкладнай разьбіўкі работ па групах кожны калгас павінен ўстанавіць ацэнку работ і разьбіўку іх па групах, прыстасоўна да ўмоў сваёй гаспадаркі.

4. Вынікі гаспадарчай дзейнасьці калгасу залежаць ад таго, наколькі калгас своячасна правёў сяўбу і ўборку і наколькі забясьпечана закаваньне маладняка ў час апросу і ацёлаў, таму ўдзел калгасьнікаў у працы ў напружаныя пэрыяды сельгаспрацаб дае права на атрыманьне большай часткі ўраджаю і даходаў, чым работа ў той час, калі калгасу менш патрэбна працоўных затрат.

НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру прапануюць праўленьням калгасаў рабіць налічэньне павялічанай колькасьці працадзён калгасьнікам за поўны выхад на работу, выкананьне і перавыкананьне норм выпрацоўкі ў пэрыяды пасеваў, праполкі, уборкі, апрацоўкі лёну і канапель і ў час апросу у разьмеры 10—15 проц. ад агульнага ліку выпрацаваных калгасьнікамі ў гэтыя пэрыяды працадзён.

Тым калгасьнікам, якія ў пэрыяд напружаных работ прымалі невыстарчальны ўдзел у працы, або зусім ня выходзілі на работу, зьнижаць налічаную ім агульную колькасьць працадзён на 10 проц.

5. Брыгадзе, якая перавыканала заданьне па выхаду прадукцыі звыш устаноўленага плянам, рабіць дадатковае налічэньне працадзён за кожны цэнтнер зярнёвых 3—4 працадні, за кожны цэнтнер валакна 7—10 працадзён, за кожную тону бульбы і кораньплодаў 7—10 працадзён, за кожны цэнтнер гародніны 3—4 працадні.

За перавыкананьне брыгадай гадавога заданьня па выхаду прадукцыі жывёлагадоўлі, рабіць дадатковае налічэньне працадзён за кожны атрыманы звыш вытворчага заданьня цэнтнер малака—2 працадні, за выгадаванае парасё—5 працадзён, за кожнае цялё—10 працадзён.

При невыкананьні заданьня па выхаду прадукцыі ў паляводзтве, гарадніцтве і жывёлагадоўлі робіцца зьніжэньне ў такім-жа разьмеры за кожную адзінку атрыманай прадукцыі.

6. Устанавіць дадатковае налічэньне працадзён тым калгасьнікам, якія беражна адносяцца да замацаваных да іх коняй, за захаваньне коняй у добрым выглядзе і добрай ухарчаванасьці ў разьмеры 10—20 проц. агульнай колькасьці працадзён, выпрацаваных калгасьнікам.

За нядбайныя адносіны да каня, дрэнны дагляд, дрэнную ўхарчаванасьць, рабіць зьніжэньне працадзён у разьмеры 10—30 проц. працадзён, выпрацаваных калгасьнікам.

Праўленьні калгасаў, сумесна з рэвізійнымі камісіямі, павінны рабіць праверку становішча коняй, прымацаваных да пасобных брыгад і калгасьнікаў, пасьля кожнага пэрыяду работ, але не радзей як пяць разоў у год.

За злачынныя адносіны да каня, за калецтва і падзеж каня па віне калгасьніка, які на ім працаваў, калгасьнік аплачвае калгасу кошт паўтала каня.

7. У зьмену і дадатак да п. 9 палажэньня «Аб рабоце брыгадзіра і парадку ацэнкі яго працы», выданага Калгасцэнтрам БССР (ліпень 1931 г.), устанавіць налічэньне працадзён брыгадзіру за кіраўніцтва брыгадай і работы па абмеры, узважваньні, уліку працы і запісу працадзён па 1 сотцы працадню ад колькасьці працадзён, выпрацаваных усёй брыгадай.

8. Ацэнку працы трактарыстаў утвараць ня толькі за колькасьць выкананай работы, але і за якасьць. Запіс працадзён у працоўную кніжку трактарыста-калгасьніка ўтвараецца паляводам калгасаў, пры ўдзеле старшага трактарыста МТС.

9. У мэтах барацьбы з разбазарваньнем працадзён устанавіць, што колькасьць працадзён для абслугоўваючага адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу калгасаў і агульная сума даходаў, якая належыць гэтым калгасьнікам па працаднёх, не павінны перавышаць 1½—2 проц. валавога даходу ў буйных калгасах і 2—3 проц. у дробных калгасах.

Аб вучоце працы

Для забясьпячэньня своячасовага і правільнага ўліку працы калгасьнікаў у 1932 годзе НКЗ і Праўленьне Калгасцэнтру прапануюць устанавіць наступны парадак:

а) улік колькасьці і якасьці работы кожнага калгасьніка і запіс у працоўныя кніжкі ўтварае брыгадзір;

б) вучот выкананай работы на палявых работах праводзіцца штодзённа, а запіс працадзён у працоўную кніжку калгасьніка не радзей аднаго разу ў пяцідзённку, а ў жывёлагадоўлі штомесячна ў адпаведнасьці з атрыманьнем прыплоду і выяўленьня прыросту мясной жывёлы і маладняка; у малочных фэрмах запіс працадзён утвараецца штодзённа, выходзячы з колькасьці надоенага малака.

2. Абавязаць праўленьне калгасаў штомесячна (не пазьней 5 числа кожнага месяца) падлічваць агульную колькасьць працадзён, выпрацаваных калгасьнікамі і ўтвараць запісы ў спэцыяльную кнігу вучоту працадзён і практыкаваць вывешваньне сьпісаў калгасьнікаў і колькасьці выпрацаваных працадзён па-брыгадна.

3. Абавязаць старшынь праўленьняў Калгассаюзаў і калгасаў узяць пад свой непасрэдны нагляд забясьпечань не калгасаў працоўнымі кніжкамі, фор мамі і бляшкамі па вучоце працы і ў самы кароткі тэрмін выдаць калгасьнікам працоўныя кніжкі.

4. Абавязаць сэктар кадраў Калгасцэнтру і Калгассаюзы закончыць пад рыхтоўку і выпуск рахункавых работнікаў для калгасаў, не пазьней як за 10 дзён да пачатку веснавой сяўбы.

5. Абавязаць праўленьні Калгасаюзаў да пачатку веснавой сяўбы правесьці ва ўсіх раёнах 3-х дзённыя курсы канфэрэнцыі калгасных рахункаводаў, на якіх прапрацаваць пытаньні калгаснага ўліку.

Кантроль і праверка выкананьня

1. Кантроль і праверка работы брыгад праводзіцца праўленьнямі альбо па пастанове праўленьня камісіяй у складзе члена праўленьня калгасу, члена рэвізійнай камісіі і лепшага ўдарніка тэй брыгады, работа якой правяраецца. Праверка праводзіцца ў ходзе выкананьня вытворчых заданьняў па пэрыодах (сяўбы, міжрадная апрацоўка, уборка, злучная кампанія, ацёл, апрос).

2. У мэтах ліквідацыі абязьлічкі ў рабоце па праверцы, кожны член праўленьня і рэвізійнай камісіі павінен быць прымацаваны да пэўнай колькасьці брыгад.

3. Праверачная камісія робіць прыёмку ад брыгад і брыгадзіраў выкананых работ па скончэньні сяўбы і зьяўленьні ўсходаў, пасьля заканчэньня работы па міжрадным апрацоўцы, уборцы ўраджаю і апрацоўцы, асабліва тэхнічных культур.

4. Камісія выяўляе ці адпавядае колькасьць засеянай плошчы даным, прадстаўленым брыгадай і вытворчаму заданьню, ці адпавядае якасьці работы агрэзатэхнічным правілам і тым заданьням якія даны праўленьнем калгасу, а таксама ці адпавядае колькасьць палічаных працадзён брыгадзірам кантрольнаму заданьню праўленьня калгасу як па якасных, так і па колькасных паказьніках.

5. Пасьля скончэньня праверкі камісія складае ў пісьмовай форме акт, які перадае праўленьню калгасу.

Арганізацыйна-масавыя мерапрыемствы

1. Задача арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў настойліва патрабуе ад калгасных арганізацый стварэньня і выхаваньня калгаснага актыву з ударнікаў калгасьнікаў. Райза, Калгассаюзы і праўленьні калгасаў павінны весьці сыстэматычную работу па вывучэньні і стварэньні калгаснага актыву. Правесьці дакладны вучот лепшых калгасьнікаў-ударнікаў, праводзіць з імі канфэрэнцыі і нарады, пасылаючы лепшых на курсы, па падвышэньні кваліфікацыі і больш шырока вылучаць на вытворчую і кіруючую работу жанчын-калгасьніц.

2. НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру БССР абавязвае ўсе райза, праўленьні Калгассаюзаў і калгасаў правесьці шырокую масавую работу сярод калгасьнікаў, вакол выкананьня вытворчых заданьняў у надыходзячую веснавую пасеўкампанію, паклаўшы ў аснову гэтай кампаніі пастанову ЦК КП(б)Б ад 22-II—1932 г. аб «чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў», адозву ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі, пастанову ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб правядзеньні веснавой с-г. кампаніі 1932 г.

Райза, праўленьням Калгассаюзаў і калгасаў забясьпечыць прапрацоўку ва ўсіх калгасах гэтых рашэньняў, а таксама і пастанову НКЗ і Калгасцэнтру БССР аб арганізацыі працы ў калгасах.

3. У барацьбе за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за выкананьне і перавыкананьне пляну 1932 г., на аснове ўкараненьня ў практыцы калгасу 6 умоў т. Сталіна, выкарыстоўваючы набыты вопыт, калгасы павінны паказаць новыя ўзоры высокапрадукцыйнасьці калектыўнай гаспадаркі, уздыму ўрачкайнасьці і павялічэньня выхаду таварнай прадукцыі, развіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, узьнаўленьне прадукцыйнасьці працы і шырокага разгорнутаньня сацыяборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі, таксама паміж пасобнымі калгасамі за выкананьне і перавыкананьне вытворчых заданьняў.

Вясьці рашучую барацьбу з выпадкамі падмены актыўнасьці і самадзейнасьці калгасных мас голым адміністраваньнем, з праявамі кулацка - спажывецкіх тэндэнцый, ачышчаючы калгасы ад кулацкіх элемэнтаў.

Нам Наркома Земляробства БССР
ПАНІМАТКА.
Старшыня праўленьня Калгасцэнтру БССР МІЦЬКОЎ.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б прапануе санатарам партыйных і камсамольскіх арганізацый тых прадпрыемстваў і ўстаноў, у якіх працуюць студэнты, якія ў сьнежні м-цы 1931 году скончылі РАБФАК БДУ і павінны былі 1-га лютага г. г. зьявіцца на вучобу ў ВПІ і БДУ, але да гэтага часу не зьявіліся, чым зрываюць укамплектаваньне зімовага набору ВПІ і БДУ, а таксама плянавую падрыхтоўку падкадраў, аслабяюць іх ад працы на прадпрыемствах і ва ўстановах і ў двухдзённы тэрмін накіраваць у распараджэньне рэктара БДУ.

Просьба Мен. Гар. КК-РСІ у 2-х дзённы тэрмін праверыць выказаньне дадзеннага распараджэньня.

Нам. Загадчыка Культпропу ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.

Нам адказн. рэдактара Г. АДАМСОН.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня — ЗАМЖНЫ ФІЛЬМ ТЭМБІ

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз. — МЕСЯЦ ЗЬЛЕВА

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ" — ЧАЛАВЕК З МЯСТЭЧКА

На падставе пастановы СНК БССР ад 23-II 1932 г.
БЕЛСАДГАРОДСАЮЗ І ЯГО СЫСТЭМА
ЛІКВІДУЕЦЦА
З 1-III г. г. пачалі працваць ліквідацыйныя камісіі Белсадгародсаюзу (Савецкая, 46) і яго кантор, у якія патрэбна адрасаваць усю перапіску па справам выплога Белсадгародсаюза.
Усе прэтэнзіі да Белсадгародсаюзу і яго сыстэмы будуць прымацца ліквідкомамі апошніх да 25-III г. г., пасьля якога тэрміну прэтэнзіі разглядацца ня будуць.
Прэтэнзіі павінны прадяўляцца непасрэдна ліквідкому той канторы, па разьліках з якой гэткія ўзьнікілі.
Ліквідком Белсадгародсаюзу

БЕЛАРУСКІ
Дзяржаўны Вышэйшы Вячэрні Педінстытут
АБВЯШЧАЕ ВЕСНАВЫ НАБОР
на дашкольнае аддзяленьне педалёга-п дагагічнага факультэту
Заявы прымаюцца да 25-га сакавіка
ў канцылярыі педінстытуту (Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, галоўны корпус, пакой № 2-31).
Правілы прыёму абвешчаны ў даведніку НКА.
Аб пачатку заняткаў на вячэрнім дашкольным аддзяленьні будзе паведамлена асобна.
Стыпэндыяй і інтэрнатам студэнты вячэрняга педінстытуту не забясьпечваюцца
Дырэктар ВПІ В. РУДНІЦКІ

БЕЛАРУСКІ
ДЗЯРЖАЎНЫ ВЫШЭЙШЫ ПЭДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ
АБВЯШЧАЕ ВЕСНАВЫ ПРЫЁМ студэнтаў на наступныя факультэты
1. Літаратурна-лінгвістычны ф-т—лінгвістычнае аддзяленьне.
2. Сацыяльна-эканамічны ф-т—гістарычнае аддзяленьне.
3. Педалёга-педагагічны факультэт—аддз. дзеткамруху.
Правілы прыёму абвешчаны ў даведніку НКА
Заявы прымаюцца да 25-III г. г. у канцылярыі інстытуту (Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, галоўны корпус—вышэйшы педінстытут).
Аб дні пачатку заняткаў будзе паведамлена асобна.
Дырэктар ВПІ В. РУДНІЦКІ

ЧАЧЭРСКІ
Сельска-Гаспадарчы Тэхнікум Сьвінага аўлі
АБВЯШЧАЕ
ВЕСНАВЫ НАБОР на 1-ы КУРС тэхнікуму
Заявы падаюцца па адрасе: м. Чачэрск (Гомельшчына) Сьвінагадоўчаму тэхнікуму, да 20 сакав ка 1932 г.
Да заявы прыкладваюцца ўсе дакумэнты, згодна з пераліку НКА за 1931-31 г. З 15 па 20 сак віка праводзяцца іспыты асобам, якія ня могуць паступіць у тэхнікум без іспытаў.
Прымаюцца ў тэхнікум асобы скончыўшыя 7-годку і якія зараз навучаюцца ў 7-х групах 7 год к
Студэнты завісь ечаюцца стыпэндыяй і інтэрнатам адноль ка з індустрыяльнымі тэхнікумамі.
Заняткі з новым наборам пачнуцца з 1-га красавіка 1932 г.
Аб залічэньні ў тэхнікум паведамім з в- будзе паведамлена персанальна
Дырэктар тэхнікуму Суконьнікаў

ВІЦЕБСКІ
Індустрыяльна - Пэдагагічны ІНСТЫТУТ
ГРАВОДЗІЦЬ НАБОР
НА ПЕРШЫ КУРС ЗАВОЧНАГА СЭКТАРУ
на аддзяленьні:
фізыка тэхнічнае і хэміка-тэхналёгічнае
Тэрмін прадстаўленьня заяў 25-га сакавіка
Дакумэнты прадста